ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДОЧЬНЯ XV
№ 121 (4373)
АЎТОРАК, 31 мая 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

СЕНЬНЯ Ў НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Больш увагі дробязям рабочага быту.
М. ЯНОЎСКІ—Чырвоная армія чакае поўнацэннага папаўненьня (2 стар.).
ЗОРЫН—Ліквідаваць абязьлічку ў кормаздабываньні (3 стар.).
ШЫРОКА РАЗГАРНУЦЬ КАЛГАСНЫ ГАНДАЛЬ—пастанова Наркамзему СССР і Калгасцэнтру СССР (1 стар.).
Большасьць МТС яшчэ не паказала ўзорных тэмпаў сяўбы (1 стар.).
Умацаваньне і перабудова нізавых партарганізацый—важнейшае зьвяно ў барацьбе за прамфінплян, за клясавае выхаваньне рабочых мас (2 стар.).
Мабілізаваць адкіды вытворчасьці на павялічэньне выпуску тавараў шырокага спажываньня (3 стар.).
ПЛЕНУМ ЦК ГЕРМАНСКАЙ КАМПАРТЫІ. Кампартыя паказвае шлях барацьбы супроць фашызму (4 стар.).
Адстаўка ўраду Брунінга. (4 стар.).
Пратэсты працоўных БССР супроць разгрому ТБШ (4 стар.).

Больш увагі дробязям рабочага быту

Наша рабочая кляса — кляса-гегемон, кляса-будаўнік сацыялістычнага грамадзтва — увасабляе ўсё лепшае, усю сілу і магутнасьць перадавога атраду працоўнага чалавецтва, закліканага гісторыяй зруйнаваць векавыя ўстоі капіталістычнага рабства, зьнішчыць эксплёатацыю чалавека чалавекам, стварыць новую эканоміку, новы грамадзкі лад, прадначыртаны геніяльнымі вадзіцелямі — Марксам - Энгельсам-Леніным - Сталіным.

У жорсткай клясавай барацьбе, пад вадзейным кіраўніцтвам свайго авангарду — камуністычнай партыі, на аснове яе ленінскай генеральнай лініі, пралетарыят Савецкага саюзу пераможна будуе сацыялізм, упэўнена ідзе да сваёй капчатковай мэты, стварае тып новага чалавека, з новымі адносінамі да працы, як да справы гонару, справы адвагі і гераізму, новага чалавека-ўдарніка перадавой брыгады міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі. За сабой рабочая кляса вядзе шматмільённыя масы працоўных, перавыхоўвае іх на пачатках калектывізму, прышчапляе ім звычкі камуністычных мэтадаў працы.

Усё ўзрастаючы палітычны і культурны ўзровень рабочай масы па-новаму ставіць зараз пытаньні кіраўніцтва вытворчым жыцьцём, высоўвае ў якасьці адной з важнейшых задач задачу ўзмацненьня ўвагі да канкрэтных, штодзенных патрэб рабочых, спэцыялістаў, служачых. Патрабаваньні ў гэтых адносінах узрасьлі ў вялізарнай ступені.

Рабочая кляса, якая гераічна змагаецца за ажыцьцяўленьне прамфінпляну, праяўляе вялізарнейшую зацікаўленасьць да аўладаньня навукай і тэхнікай, імкнецца ўсё больш і больш пазнаёміць свой палітычны кругавід. Растуць матар'яльныя і культурныя запатрабаваньні мас.

Абагуленьне гэтых новых зрухаў у асяродзішчы пралетарыяту і вынікаючыя адсюль задачы з выключнай яркасьцю выказаны ў словах **тав. Сталіна: «Цяперашні рабочы, наш савецкі рабочы, хоча жыць са здавальненьнем усіх сваіх матар'яльных і культурных патрэбнасьцяй і ў сэнсе забесьпячэньня харчамі, і ў сэнсе кватэр, і ў сэнсе забесьпячэньня культурных і ўсякіх іншых патрэбнасьцяй. Ён мае на гэта права і мы абавязаны забясьпечыць яму гэтыя ўмовы».**

Ажыцьцяўленьне гэтага ўказаньня правадыра партыі складае адну з галоўных тактычных задач, туальнейшых праблем сёнешняга дня. З вырашэньнем яе непарыўна зьвязана ажыцьцяўленьне народна-гаспадарчага пляну, рост сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, узьдым прадукцыйнасьці працы.

Дасягненьні ў галіне матар'яльнага і культурна-бытавога становішча рабочай клясы вялізарныя і растуць з кожным днём. Асабліва рэльефна яны выказваюцца пры параўнаньні з тымі жахлівымі ўмовамі беспрацоўя, голаду і галечы, у якіх знаходзіцца пралетарыят капіталістычных краін.

Наш савецкі рабочы ня ведае беспрацоўя. Базуцьнна расьце яго заработная плата, павялічваецца бюджэт рабочай сям'і. Важнейшым заваяваньнем зьяўляецца шырокі размах сацыяльнага страхаваньня, рамонт здароўя рабочых. Мацнее грамадзкае харчаваньне, растуць фонды прамтавараў. Павялічваецца сетка бытавых устаноў. Рабочым шырока адкрыт доступ да навукі, да культурнага ўдасканаленьня.

Дасягненьні вялікія, яны бясспрэчны. Але яны яшчэ невыстарчальны з пункту погляду ўсё ўзрастаючых патрэбнасьцяй рабочых мас. **Упарта працаваць над далейшым паляпшэньнем матар'яльнага і культурна-бытавога абслугоўваньня рабочага — баявая гаданавая задача ўсіх парт-арганізацый, прафсаюзаў, саветаў, камсаколу і каапэрацыі.**

Што зараз **асабліва важна** для дальнейшага вучастку работы? Што зьяўляецца **асноўным** зьвяном? **Трэба больш аддаваць увагі ПААСОБНЫМ рабочым, глыбей уваходзіць у ДРОБЯЗІ рабочага быту.** Іменна так паставіў пытаньне **тав. Каганавіч** у сваім выступленьні на IX зьезьдзе прафсаюзаў. Ён сказаў: **«Мы часта апэруем вялікімі лічбамі, сотнямі тысяч, мільёнамі рабочых. І гэта статыстыка плюс агульныя адцягненыя рэзалюцыі часамі засланяюць ад апарату, нават прафсаюзнага, твар жывога, канкрэтнага рабочага, з яго горам, і радасьцю, з яго патрэбамі і запытаньнямі».**

Гэтыя словы маюць найглыбейшы сэнс. Яны канцэнтруюць увагу партыі на вельмі важнай задачы, на адным з рашаючых вучастка работы. Яе трэба асабліва падкрэсьліць **перад прафсаюзамі**, якія абавязаны з выключнай чуласьцю прыслухоўвацца да запатрабаваньняў рабочага, непасрэдна ведаць яго інтарэсы і патрабаваньні. Пільнае вока прафработніка павінна прасякаць у сталоўку, ЗРК, цырульню, пральню, лазьню, у кватэру рабочага, клюб, бібліятэку. Вакол усіх даных пытаньняў трэба канцэнтраваць **значна больш увагі** прафсаюзных арганізацый.

Возьмем нашу беларускую практыку. Лёгка паказаць, што ў гэтым напрамку партыйным, прафэсыянальным і савецкім арганізацыям прадстаіць прарабіць яшчэ вельмі многа.

Трэба прызнаць, што важнейшае палітычнае значэньне так званых дробязяй рабочага быту некаторымі арганізацыямі яшчэ ў выстарчальнай ступені і да гэтага часу не ўсьвядомлена. Не адзінкавы выпадкі, калі партыйныя, прафсыяпальныя работнікі за ўсёй масай штодзённай работы не заўважваюць гэтых дробязяй, праходзяць міма іх, аддаюць невыстарчальную ўвагу патрэбам асобных рабочых. Часамі гэта мяжуецца з простым бюракратызмам, бяздушшам.

Падамо некалькі прыкладаў. Рабочы заводу імя Молатава **тав. Рахоўскі** звольнен як прагульшчык таму, што паведаміў аб сваёй хваробе са спазьненьнем на два дні, якія ён праляжаў у больніцы, рыхтуючыся да апэрацыі. Стары рабочы гуты «Пралетары» **тав Вяршук**, будучы пераведзен на часовую інваліднасьць, ужо больш тыдню ходзіць на завод за разьлікам і ня можа яго атрымаць. На фабрыцы «Камупарка» работніцу **тав. Канатопскую**, ня гледзячы на пастанову працсэсіі, доўгі час не пераводзяць на лёгкую работу. Рабочы фабрыкі імя 8-га сакавіка **тав. Гофман** з пачатку 1931 году прымацаваны да б. жакту № 10, але **па чыста фармальных прычынах** не атрымаў да гэтага часу кватэры, хаця жыве ў зруйнаваным сутарэньні.

Аб чым гавораць усе гэтыя факты? Бязумоўна яны гавораць аб бюракратычных адносінах да рабочага з боку тых працаўнікоў, якія разглядалі прыведзеныя справы. Гэтыя факты гавораць аб наяўнасьці няўважлівасьці з боку гэтых работнікаў да патрэб паасобных рабочых.

Адсюль ясна неабходнасьць рашучай барацьбы з праяўленьнямі бюракратычнага бяздушша, неабходнасьць максымальнага ўзмацненьня ўвагі да пытаньняў матар'яльнага і бытавога абслугоўваньня мас.

Недахопы нярэдка параджаюцца не адсутнасьцю магчымасьцяй наладзіць як належыць справу, а простай няўважлівасьцю, нежаданьнем паасобных работнікаў прыкласьці ўсе намаганьні, каб як мага лепш абслужыць рабочага спажыўца.

Чым сапраўды можна апраўдаць антысанітарнае становішча многіх пашых лазьняў, цырульняў, сталовак? Нара, тавагішчы, пакончыць з такім становішчам, што нават у Менску работы не заўсёды можа папасьці ў лазьню, выключна з-за ўнутраных неладак і расхлябанасьці ў рабоце абслугоўваючага пэрсаналу лазьняў. Трэба канчаць з такімі «тлумачэньнямі», што лазьня закрыта, бо «няма вады, няма дроў» і г. д. Хто санкцыянаваў звычайную адсутнасьць у лазьнях ваннаў, як нейкага «прадмету раскошы»?

Вядома, што ў многіх сталоўках ужо паміма дрэннай арганізаванасьці падачы абедаў, паміма антысанітарыі, якасьць страў значна зьніжаецца з-за абураючага, нязахайнага скарыстоўваньня, а часамі і псаваньня прадуктаў. Нават у дыэтычнай рабочай сталоўцы № 11 (Менск) рэзка кідаецца ў вочы бруд, чаргі, нежаданьне нават прамыць як сьлед прадукты. У сталоўцы будаўнікоў № 24 адміністрацыя самавольна і бяз усякіх падстаў скараціла нормы хлеба. У сталоўцы № 2 ТСТ тое-ж самае з мясам.

Возьмем пытаньне руху ў горадзе. Як скарыстоўваецца трамвайны парк? Ці ёсьць тут пэўная мэтаімклівасьць, улік запатрабаваньняў рабочых мас? Гэтага ўліку няма. Адсутнічае манэўраваньне саставам вагонаў у інтарэсах лепшага абслугоўваньня рабочых, прадастаўленьне ім умоў зручней і хутчэй папасьці на работу і вярнуцца дадому, атрымаць магчымасьць скарыстаць выходны дзень за горадам, у лесе.

Такое-ж становішча і з прыгарадным дачным чыгуначным рухам. Расклад цягнікоў (хапя-б у напрамку Ратамкі, Ждановічы і інш.) не забясьпечвае магчымасьці рабочым і служачым правесьці за горадам цэлы выходны дзень. Гэты момант, як відаць, пры складаньні раскладу зусім ня ўлічваўся.

Сярод другіх пытаньняў трэба адзначыць неабходнасьць арганізацыі вольнага часу рабочых, у прыватнасьці новых пластоў рабочых і моладзі. У гэтых адносінах прафсаюзамі робіцца яшчэ вельмі мала. Возьмем для прыкладу Менск. Нават і тут становішча з масава-культурным абслугоўваньнем прызнаць зусім здавальняючым нельга. Арганізацыя парку культуры і адпачынку да гэтага часу задзіраецца. У садзе «Прафінтэрн» ніякай культурна-масавай работы не вядзецца. Ня гледзячы на наяўнасьць грашовых сродкаў, дом 5-га дня ўдарніка ня будуецца. Да апошняга часу няма ніякай культработы ў буйнейшым у БССР доме адпачынку імя 11-га ліпеня — у Ждановічах. Ня гледзячы на рад пастаноў не пабудавана купальня і г. д. Такія паасобныя недахопы трэба зжываць больш рашуча.

Работа па паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочых складае для беларускіх арганізацый адзін з тых вучасткаў, які мае патрэбу ў **найбольш рашучым і хутчэйшым падцягваньні.** Гэта адзначыў з усёй сілай першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Гікало** яшчэ ў сваім выступленьні на XIV партзьезьдзе. Указаўшы на рад недахопаў у культурна-бытавым абслугоўваньні рабочых мас, тав. Гікало падкрэсьліў, што: **«Толькі пры ўмове, калі мы будзем сапраўды змагацца за дробязі быту рабочых, мы зможам забясьпечыць далейшае будаўніцтва сацыялізму, толькі тады, калі мы сапраўды на гэтых дробязях дакажам рабочым, што мы можам выконваць абавязацельствы, узятыя на сябе, толькі так можна працаваць».**

На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што многія арганізацыі з гэтага ўказаньня належных практычных вывадаў яшчэ не зрабілі.

Высоўваючы работу па далейшым паляпшэньні матар'яльнага і культурна-бытавога становішча рабочых мас у лік першачарговых задач, узмацняючы ўвагу да патрэб асобных рабочых, мы яшчэ больш пашырым дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва, паскорым тэмпы нашага гаспадарчага і культурнага разьвіцьця.

Толькі апартуніст, толькі бюракрат можа недаацэньваць і ігнараваць гэту работу. **«Няма больш гаданавай задачы для бальшавіка-рэвалюцыянэра, які змагаўся дзесяткі год за ідэю рабочай клясы, як справа дапамогі рабочым, справа паляпшэньня становішча рабочых». (Каганавіч).**

Большасьць МТС яшчэ не паказала ўзорных тэмпаў сяўбы

Выканаць пастанову ЦК КП(б)Б, наладзіць апэрацыйнае кіраўніцтва сяўбой

ЧОРНАЯ ДОШКА

МТС, як магутны вагар арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, у барацьбе за высокі ўраджай і поўнае выкананьне плянаў трэцяй бальшавіцкай вясны, павінны паказаць узоры ўдарнай работы. Выкананьне задач, пастаўленых партыяй перад МТС, зараз правяраецца на практычнай рабоце ў часе пасеўнай кампаніі.

Між тым, апошнія даныя аб ходзе сяўбы па БССР паказваюць, што рад МТС не змагаюцца па-бальшавіцку за выкананьне ўскладзеных на іх задач партыяй. Значная частка МТС вядзе сяўбу недапушчальна марудным тэмпамі, чым фактычна праяўляе недаацэнку важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі.

За зрыў раньніх тэрмінаў сяўбы, невыстарчальную арганізацыю працы і нязначнае выкананьне пасеўнага пляну заносім на чорную дошку наступныя МТС.

Ільнамалочныя МТС

1) **Сураская** — 19,4 проц. выкананьня пляну, 2) **Полацкая** — 18,9 проц., 3) **Расонская** — 13,3 проц., 4) **Сіроцінская** — 12,3 проц., 5) **Бялыніцкая** — 8,6 проц., 6) **Гарадоцкая** — 8 проц., 7) **Бешанковіцкая** — 6,3 проц., 8) **Талочынская** — 3,7 проц.

Бульбяна-жывёлагадоўчыя МТС

1) **Плешчаніцкая** — 20,3 проц., 2) **Лагойская** — 17,5 проц., 3) **Бягомльская** — 16,4 проц., 4) **Путчынская** — 6,9 проц.

Жывёла-канапляводчыя МТС

1) **Лельчыцкая** — 28,3 проц.

Садова-гародныя МТС

1) **Рэчыцкая** — 18,5 проц., 2) **Магілеўская** — 17 проц., 3) **Віцебская** — 9,6 проц.

ЗВОДКА ТРАКТАРАЦЭНТРУ

аб ходзе сяўбы па МТС БССР на 25 мая 1932 году

№ п. п.	Назва МТС	Усяго засеяна ў проц.	У тым ліку Ільну ў проц.	У тым ліку Бульбы ў проц.
	ІЛЬНА-МАЛОЧНЫЯ МТС			
1.	Мсьціслаўская	55,9	59,8	25,3
2.	Ветрынская	37,6	38,5	24,6
3.	Дрысенская	34,2	26,4	16,0
4.	Боркавіцкая	31,6	39,0	10,1
5.	Чавуская	31,0	27,0	35,9
6.	Горацкая	30,9	16,7	23,8
7.	Лёзьнянская	26,8	50,2	6,4
8.	Сеньненская	26,0	35,2	23,6
9.	Дубровенская	23,5	16,0	19,3
10.	Лепельская	23,5	15,1	24,9
11.	Асьвейская	23,2	12,4	—
12.	Шклоўская	21,7	1,1	34,7
13.	Вушацкая	21,3	20,2	31,4
14.	Чашніцкая	20,7	8,2	19,6
15.	Сураская	19,4	18,6	5,8
16.	Полацкая	18,9	5,4	23,7
17.	Расонская	17,3	6,2	3,9
18.	Сіроцінская	12,3	10,6	4,8
19.	Бялыніцкая	8,6	0,2	0,9
20.	Гарадоцкая	8,0	12,7	1,4
21.	Бешанковіцкая	6,3	2,3	—
22.	Талочынская	3,7	6,5	—
	Разам:	23,4	20,3	16,2
	БУЛЬБЯНА - ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫЯ МТС			
1.	Клімавіцкая	58,2	37,1	69,1
2.	Талеская	56,9	37,1	54,8
3.	Вузьдзенская	50,2	16,6	42,8
4.	Слуцкая	47,9	15,0	41,8
5.	Капыльская	41,0	9,2	21,9
6.	Цялуская	37,7	11,2	25,9
7.	Цярэхаўская	37,3	33,3	12,1
8.	Жлобінская	35,0	33,6	32,2
9.	Рагачоўская	33,6	11,5	22,8
10.	Койданаўская	31,9	5,6	23,0
11.	Заслаўская	31,6	4,1	46,3
12.	Пухавіцкая	31,0	9,1	17,8
13.	Касьцюковіцкая	27,1	61,7	31,1
14.	Бальшавіцкая	26,7	—	36,1
15.	Б.-Кашалёўская	26,5	19,8	21,8
16.	Смалявіцкая	25,5	3,5	17,9
17.	Ст.-Дароская	24,9	10,4	11,1
18.	Плешчаніцкая	20,3	—	25,7
19.	Лагойская	17,5	1,3	16,3
20.	Вягомльская	16,4	—	15,2
21.	Путчынская	6,9	—	9,0
	Разам:	33,4	14,9	30,4
	ЖЫВЁЛА-КАНАПЛЯВОДЧЫЯ МТС			
1.	Жыткавіцкая	61,9	100,3	86,4
2.	Тураўская	55,7	41,1	36,6
3.	Старобінская	50,1	56,5	43,5
4.	Даманавіцкая	47,5	44,7	41,0
5.	Лельчыцкая	28,3	47,3	12,7
	Разам:	49,9	61,3	42,1
	САДОВА - ГАРОДНЫЯ МТС			
1.	Гомельская	25,0	15,1	18,0
2.	Менская 1-я	24,4	—	29,8
3.	Аршанская	20,4	25,7	18,2
4.	Барысаўская	19,6	0,3	24,5
5.	Рэчыцкая	18,5	11,6	11,4
6.	Магілеўская	17,0	2,6	13,2
7.	Віцебская	9,6	4,0	5,7
	Разам:	19,1	9,0	17,3
	ТАБАЧНАЯ МТС			
	Хойніцкая	49,5	39,5	22,2
	Разам па БССР:	30,6	20,1	24,7

Аграном САПЕГА.

ЧЫРВОНЫ СЬПІС

кандыдатаў на прэміяваньне за лепшае і хутчэйшае сканчэньне сяўбы

ПАРЫЧЫ.

У адказ на пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР перадавыя калгасы Парычскага раёну, шырока разгарнуўшы паміж брыгадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў вызначаны партыяй і ўрадам тэрмін, скончылі сяўбу з перавыкананьнем пляну.

Калгасы **«Чырвоны сьцяг», Ламавіцкага** сельсавету, **«Кастрычнік», Парыцкага** местачковага савету, скончылі сяўбу на 20 мая, перавыканаўшы свае пляны па аўсе і бульбе першы на 7 гэкт., другі—на 5,5 гэкт.

Ударнымі тэмпамі праходзіла сяўба і ў калгасе **«Культура»** (Ламавіцкі сельсавет), які на 22 мая засеяў 206 гэкт., у тым ліку збожжавых — 100 гэкт., бульбы—57 гэкт., тэхкультур—17 гэкт., траў і іншых культур—32 гэкт.

Не адсталі таксама і калгасы Людзьвінаўскага і Чыркавіцкага сельсаветаў. Калгас **«Прасьвет»**, дзякуючы правільнай арганізацыі працы і апэрацыйнаму кіраўніцтву партыйнай ячэйкі, на 22 мая засеяў 83 гэкт. аўса, 28 гэкт. ячменю і пшаніцы, 60 гэкт. бульбы, 10 гэкт. ільну і 15 гэкт. іншых культур. Усяго засеяна калгасам 196 гэкт.

Скончылі сяўбу да гэтага-ж тэрміну калгасы **«Новы шлях», «Чырвоны сьцяг»**, Чыркавіцкага сельсавету. Апошнім засеяна 104 гэкт. **Л-ч.**

* * *

БАБРУЙСК.

Калгас імя **Варашылава**, Цялускага сельсавету, на 6 дзён раней вызначанага тэрміну скончыў сяўбу з перавыкананьнем пасеўпляну. Патрэбна было засеяць 37 гэкт., а засеяна 80. Гэтых посьпехаў калгас дасягнуў дзякуючы добрай арганізацыі працы. 19 мая лепшыя калгаснікі—змагары за выкананьне пляну сяўбы—былі прэміяваны прамтаварамі. **Г. Н.**

* * *

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону ад наш. спэцкора).

Калгас «Савецкая Каменка», Зэмбінскага сельсавету, 27 мая скончыў сяўбу яравых культур, засеяўшы звыш пляну: ячменю—4,6 га, гароху—1,8 га, пшаніцы—1,25 га, лубіну—1,22 га.

Калгас «Камсамолец», Касьцюкоўскага сельсавету, таксама скончыў сяўбу 28 мая, перавыканаўшы пляны: па ячмені—на 5 га, па пшаніцы—на 1,5 га, па гароху—2,5 га, па віцы—1 га

* * *

ВУШАЧЫ. (Па тэлеграфу). Калгас «Новы шлях» датэрмінова скончыў сяўбу на плошчы 585 га. Калгас аказаў дапамогу двум суседнім калгасам 70 працаднямі. Лепшыя ўдарнікі сяўбы прэміяваны.

* * *

КРУПКІ. (Па тэлеграфу). Калгас «Зьвязда» 27 мая скончыў сяўбу яравых, выканаўшы задані[illegible] на 108 проц. Вядучай культуры ў калгасе—ільну—засеяна звыш пляну 500 проц.

26 рабочых саўгасу „Негарэлае" прэміяваны за ўдарныя тэмпы ў часе сяўбы

КОЙДАНАВА.

Саўгас **«Негарэлае»** скончыў сяўбу на 7 дзён раней тэрміну.

Посьпехі гэтыя саўгасам атрыманы дзякуючы сацыялістычным мэтадам працы. Рабочыя амаль цэлы месяц працавалі з вялікім энтузіязмам, па 10-12 гадзін у дзень, перавыконваючы нормы выпрацоўкі. Зараз саўгас **«Негарэлае»** пераключыўся на дапамогу сьвінасаўгасу **«Сталіна»**, даўшы яму 3.000 пудоў бульбы, цягавую і рабочую сілу. Апрача гэтага саўгас яшчэ абавязаўся дапамагчы цягавай рабочай сілай калгасу **«Бальшавік».**

За ўдарную работу 5 рабочых саўгасу «Негарэлае» прадстаўлены для прэміяваньня Сьвінаводтрэстам. 26 рабочых прэміяваны саўгасам прамтаварамі і грашыма. Рабочы калектыў адзначыў ударную працу дырэктара саўгасу тав. **Шчаканава** і ўзнагарадзіў яго ганаровай граматай ударніка з хадайніцтвам перад трэстам аб прэміяваньні. **С. В. Лагун.**

Дзе [illegible] новым узносам с.-г. [illegible] вызн[illegible]аюць на пастановы партыі і ўрада

КАПЫЛЬ. (Наш кар.). У адказ на апошнія пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб мяса, збожжазагатоўках і новым законе аб с.-г. падатку, калгасы, калгаснікі, беднякі і сераднякі—аднаасобнікі Ляшнянскага сельсавету датэрмінова ўносяць с.-г. падатак.

Так, калгас імя **Ульянава** ўнёс **100** руб., **«Прагрэс»—120 руб., «Чырвоны дырыжабль—20, «Чырвоны пагранічнік»—45** руб. Усяго па Ляшнянскім сельсавеце на 25 мая датэрмінова ўнесена **369** руб. Паступленьні с.-г. падатку працягваюцца.

Сельсавет вывесіў чырвоны сьпіс плацельшчыкаў, якія датэрмінова ўнесьлі с.-г. падатак і чорны—злосных неплацельшчыкаў за 1931 год. **В.**

ШЫРОКА РАЗГАРНУЦЬ КАЛГАСНЫ ГАНДАЛЬ

Пастанова Наркамзему СССР і Калгасцэнтру СССР

У выкананьне пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 6 і 10 мая і ЦВК і СНК СССР ад 20 мая, калегія Наркамзему СССР і праўленьне Калгасцэнтру СССР пастанаўляюць:

1. Прапанаваць рэспубліканскім наркаматам, земкіраўніцтвам, калгасаюзам і **спэцыяльным калгасным** цэнтрам:

а) Неадкладна камандыраваць неабходную колькасьць работнікаў па месцы для шырокай прапрацоўкі з калгасамі і калгаснікамі паказаных вышэй пастаноў.

б) Пры прапрацоўцы зьвярнуць асаблівую ўвагу на пашырэньне пасеваў збожжавых, гародніны, адкорм і наогул жывёлы, гадоўлю маладняка, птушкі, трусоў, на павышэньне таварнага выхаду малака, пладоў і г. д., каб за гэты кошт забясьпечыць етварэньне дадатковых таварных фондаў для разьвіцьця гандлю калгасаў і калгаснікаў.

в) Праверыць на справе выкананьне пастановы ЦВК і СНК СССР ад 20 мая ў частцы вызваленьня ад сельска-гаспадарчага падатку і мясцовых збораў, а таксама і зьніжэньня арэндной платы за гандлёвыя памяшканьні для калгасаў і калгаснікаў.

г) Сумесна са спажывецкай, саматужна-прамысловай каапэрацыяй і дзяржгандлем памеціць разьмяшчэньне іх гандлёвай сеткі ў мясцох найбольшай рэалізацыі прадукцыі калгасаў і калгаснікаў.

д) Сумесна з калгасамі і калгаснікамі неадкладна прыступіць да разгортваньня іх гандлю (памеціць колькасьць магазынаў, што адкрываюцца, ларкоў, палатак і савецкіх базараў).

2. Кіраўніцтва гандлем калгасаў і калгаснікаў ажыцьцяўляецца Калгасцэнтрам СССР.

Апэрацыйную работу па арганізацыі гандлю калгасаў, маючых таварныя фэрмы, і калгаснікаў, уваходзячых у гэтыя калгасы, усклаць адпаведна па спэцыяльныя калгасныя цэнтры.

Абавязаць праўленьне Трактарацэнтру і дырэктароў МТС аказваць усямерную садзейнасьць разьвіцьцю гандлю калгасаў і калгаснікаў у раёнах дзейнасьці МТС.

3. Не дапускаць адміністрацыйнага прымацаваньня калгасаў і калгаснікаў да магазынаў і ларкоў, што арганізуюцца калгаснымі саюзамі і спэцыяльнымі цэнтрамі. Устанавіць, што дастаўка тавараў калгасамі і калгаснікамі ў гэтыя магазыны праводзіцца толькі на аснове добраахвотных згод іх з магазынамі.

4. Прапанаваць праўленьням калгасных цэнтраў неадкладна прыступіць да разгортваньня ўласнага гандлю сеткі саюзаў і калгасных цэнтраў з тым, каб у бліжэйшы час было адкрыта ня менш 1.050 магазынаў калгасных саюзаў і цэнтраў, з іх па лініі Плодатароднінакалгасцэнтру — 500, Мясакалгасцэнтру — 400, Сьвінаводкалгасцэнтру — 120, Аўцаводкалгасцэнтру—30.

5. Зьвярнуць асаблівую ўвагу праўленьняў калгасаў і калгаснікаў на тое, што кулацкія і спэкуляцыйныя элемэнты будуць штурхаць іх пад відам гандлю на разбазарваньне асноўнага капіталу калгасаў (продаж рабочай жывёлы, аспоўнага стада, таварных фэрм, маемасьці і г. д.), а таксама на правядзеньне гандлю за кошт прадукцыі, якая падлягае здачы дзяржаве. Супроць падобных спроб трэба весьці рашучую барацьбу.

6. Для гандлёвай работы ў калгасах павінны быць вылучаны лепшыя калгаснікі з вызваленьнем іх ад іншай работы. Ніякім чынам не дапускаць прасякненьня ў калгасны гандаль былых гандляроў, перакупшчыкаў, спэкулянтаў і асоб, дыскрэдытаваўшых сябе на каапэрацыйным і дзяржаўным гандлі.

7. Сродкі, якія выручаюцца ад продажу калгаснай прадукцыі, за вылікам расходаў па гандлі і падаткаў з гандлёвага звароту, а таксама адлічэньні ў непадзельны капітал (10-15 проц.), выдаваць калгаснікам у лік ужо адпрацаваных працадзён не радзей аднаго разу ў месяц.

8. Аплата працы калгаснікаў, занятых продажам калгаснай прадукцыі праз магазыны, ларкі і палаткі і на савецкіх базарах, устанаўляецца праленьнямі калгасаў, у залежнасьці ад колькасьці праданай прадукцыі і гандлёвага звароту; пры гэтым павінна быць улічана неабходнасьць зацікаўленасьці работнікаў у калгасным гандлі, у правільнай арганізацыі гэтай справы і ў павялічэньні аб'ёму праданай прадукцыі.

9. Работа калгасных магазынаў, ларкоў, палатак і савецкіх базараў павінна быць пабудавана такім чынам, каб пры мінімальных гандлёвых расходах яна спрыяла прыцёку не аграмаджанай часткі таварнай прадукцыі калгасаў і прадукцыі працоўных—аднаасобнікаў. Для гэтага праўленьні калгасаў павінны ўстанавіць мінімальную плату на пакрыцьцё расходаў па продажу (у магазыне, ларку, палатцы) прадукцыі калгаснікаў і працоўнага аднаасобніка і забясьпечыць правядзеньне неадкладнага разьліку за дастаўленую прадукцыю.

10. У мэтах устанаўленьня адказнасьці за захаванасьць прадукцыі што адпраўляецца для продажу, праўленьне калгасу назначае адказных асоб абавязаных здаць яе па прызначэньні а атрыманыя ад продажу грошы ў той-жа дзень адказным за продаж асобам здаваць на спэцыяльны бягучы рахунак калгасу ў бліжэйшай ашчадной касе, або аддзяленьні дзяржбанку.

11. Праўленьні калгасаў нясуць поўную адказнасьць за захаваньне пастановы ЦВК і СНК СССР ад 20-V аб продажу калгаснай прадукцыі па цэнах, якія складаюцца на рынку. Для гэтага яны сумесна з рэвізійнымі камісіямі калгасаў устанаўляюць адпаведны пастаянны кантроль за работай магазынаў, ларкоў і палатак, а таксама і за рэалізацыяй калгаснай прадукцыі на савецкіх базарах.

12. Праўленьні калгасаў з самага пачатку павінны забясьпечыць правільны ўлік паступаючай для рэалізацыі калгаснай прадукцыі, фактычна выручаных ад продажу сум гандлёвых расходаў, адлічэньняў і выдачы калгаснікам грошай ад гандлю, у лік адробленых працадзён.

13. Праўленьні калгасаў павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на правільную арганізацыю работы на савецкіх базарах, у прыватнасьці:

а) шырока разгарнуць гандаль калгаснай прадукцыі на савецкіх базарах;

б) прадастаўляць для груп калгаснікаў без затрыманьняў транспарт, неабходны для падвозкі прадукцыі на базары;

в) разам са спажывецкай каапэрацыяй спрыяць групам калгаснікаў у наладжаньні спэцыяльных месц, ларкоў і палатак на базарах;

г) прадаставіць калгаснікам вольную тару, якая ёсьць у калгасах, для перакідкі іх прадукцыі;

д) праўленьні райкалгассаюзаў і ўпаўнаважаныя спэцыяльных калгасных цэнтраў павінны арганізаваць на савецкіх рынках спэцыяльныя кансультацыі праз сваіх інструктароў па пытаньнях гандлю калгасаў і калгаснікаў.

Праўленьні калгасаў і калгаснікі павінны мець на ўвазе, што работа па разгортваньні гандлю калгасаў і калгаснікаў павінна праводзіцца пад знакам павышэньня якасных паказальнікаў, іх вытворчай работы, павялічэньня тавару прадукцыі і змаганьня з кулацтвам, спэкулянтамі і перакупшчыкамі, якія прабуюць на жыцца на калгасным гандлі.

Нам. народнага камісара земляробства СССР — ЦЫЛЬКО.

Старшыня праўленьня Калгасцэнтру СССР — КАТАЕЎ.

СТАН СЯЎБЫ ПА РАЁНЕ НА 25-е МАЯ

Пастанова сакратарыяту Менгаркому КП(б)Б ад 29 мая)*

Сакратарыят гаркому адзначае, што тэмпы сяўбы па становішчы на 25 мая не далі належнага пералому ў параўнаньні з мінулай пяцідзённай і ні ў якім рэзе ня могуць быць прызнаны здавальняючымі. Пры сярэдніх 29 проц. на раёне на 25 мая, як і раней, найбольш пагражаючымі па сяўбе застаюцца сельсаветы: Каралішчанскі—15,4 проц., Грычанскі—14 проц., Строчыцкі—18,2 проц., Гатаўскі—19,3 проц., Падгайскі—17,3%, Навадворскі—19,2 проц., Самахвалавіцкі—20,5 проц., з якіх пяць сельсаветаў абслугоўваюцца МТС, якія ганебна адсталі ў сяўбе. Гэта поўнасьцю сьцьвярджае правільнасьць пастановы бюро ЦК КП(б)Б ад 27 мая аб ходзе сяўбы па Менскім раёне.

Сакратарыят гаркому падкрэсьлівае асабліва недапушчальнае адставаньне ў тэмпах сяўбы саўгасаў Сьвінаводтрэсту і Садовагародняга трэсту. Сакратарыят гаркому папярэджвае сакратароў парт'ячэек і дырэктароў саўгасаў аб неабходнасьці рашучай ліквідацыі гэтага ганебнага адставаньня да 1 чэрвеня г. г.

Зусім не разгорнута работа па арганізацыі дапамогі аднаасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам.

Выходзячы з гэтага, сакратарыят гаркому пастанаўляе:

1. Вызначыць тэрмін сканчэньня сяўбы ўсіх збожжавых, бульбы, гародных культур, траў і кораньплодаў не пазьней 3 чэрвеня.

2. Занесьці на чорную дошку сельсаветы: Грычанскі, Падгайскі, Строчыцкі, Гатаўскі, Самахвалавіцкі, якія ня здолелі да

Партыйнае будаўніцтва

УМАЦАВАНЬНЕ І ПЕРАБУДОВА НІЗАВЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ— важнейшае зьвяно ў барацьбе за прамфінплян, за клясавае выхаваньне рабочых мас

КІРАЎНІКІ ЛЕПШЫХ ПАРТГРУП—АБ СВАЕЙ РАБОЦЕ

За павышэньне якасьці і зьместу работы партгруп

Сёньня мы зьмяшчаем выступленьні кіраўнікоў перадавых партыйных груп. Групарторгі ў сваіх выступленьнях дзеляцца вопытам, даюць паказ работы і барацьбы партыйных груп за выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну, за палітычнае выхаваньне рабочых мас.

Гэтыя выступленьні паказваюць, што партыйныя арганізацыі буйнейшых прадпрыемстваў БССР на аснове ажыцьцяўленьня пастановы ЦК УсеКП(б) аб партыйна-масавай рабоце ў цэху і брыгадзе, на аснове выкананьня дырэктыў ЦК КП(б)Б дабіліся вялікіх посьпехаў у перабудове партыйнай работы, у пераняцьні цэнтру цяжару яе ў нізавое вытворчае зьвяно. Канцэнтруючы сваю ўвагу на пытаньнях расстаноўкі партыйных сіл, на разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, ажыцьцяўляючы шэсьць умоў тав. Сталіна партыйныя групы дабіліся досыць высокіх колькасных і якасных паказальнікаў у выкананьні вытворчых праграм. Аб гэтым досыць выразна сьведчаць выступленьні групарторгаў т. т. **Шчарбіна** (Бабруйскі камбінат), **Пастухова** (Гомельскі завод «Пралетары»), **Хрычыкава** (завод імя Ланцуцкага) і інш.

Аднак, вопыт перадавых партгруп яшчэ ня стаў здабыткам усіх партыйных арганізацый, гэты станоўчы вопыт перадавых не перанесен на іншыя прадпрыемствы. І таму рад прадпрыемстваў асабліва цяжкай прамысловасьці недавыконваюць сваіх праграм. **За 20 дзён мая цяжкая прамысловасьць выканала месячны плян толькі на 20,8 проц.** Мэталяапрацоўчая прамысловасьць сваё вытворчае заданьне выканала на 41,9 проц.

Гэтыя надзвычай нізкія паказальнікі рэзка ставяць пытаньне перад партыйнымі арганізацыямі аб завяршэньні перабудовы партыйнай работы на прадпрыемствах, аб паглыбленьні зьместу работы партыйных груп. Бо адна з галоўных прычын такіх нізкіх паказальнікаў заключаецца ў тым, што партыйныя арганізацыі некаторых фабрык і заводаў і асабліва іх нізавыя зьвяньні не аўладалі этэтадамі канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва вытворчасьці, не разгарнулі па-баявому партыйна-масавай работы.

Партыйна-масавая работа на значнай частцы прадпрыемстваў застаецца нездавальняючай. Нават некаторыя з перадавых партыйных груп, якія сваім апэрацыйным кіраўніцтвам абясьпечылі пасьпяховасьць барацьбы за выкананьне вытворчых праграм, усё яшчэ **невыстарчальна разгарнулі партыйна-масавую работу**, не дабіліся сапраўды поўнага ахопу ёю кожнага рабочага, пачынаючы самым перадавым і канчаючы самым адсталым. Пацьвярджэньнем гэтаму служыць партыйная група, якой кіруе **тав. Лабанава** («Пралетарская перамога»—Барысаў). Гэта група дабілася выкананьня вытворчай праграмы, адшы[illegible] пытаньня пытаньня пытаньня

З ПЕРАДАВЫХ—У АДСТАЮЧЫЯ

Урокі сьвінсаўгасу „ІВАНЬ"

З племянных сьвінасаўгасаў «Івань» найбольш буйны і стары ў Беларусі. Асноўная задача гаспадаркі — гадоўля племянных вытворнікаў і сьвінаматак для саўгасаў і калгасаў Саюзу.

Яшчэ ў 1930 г. па ўсебеларускай сельска-гаспадарчай выстаўцы «Івань» атрымаў дыплём за паказальнае вядзеньне сьвінагадоўлі. Іваньскія сьвінь ні тады сапраўды паражалі ўсіх сваім ростам, сытасьцю і пладавітасьцю.

Калі ў 1930 г. стада сьвінаматак вылічвалася дзесяткамі, дык зараз агульнае стада саўгасу складае 870 шт., у тым ліку 228 сьвінаматак, 12 кныроў, 106 шт. маладняка ад 4 да 10 месяцаў і 524 парасяты.

Перад саўгасам партыя і ўрад паставілі задачу — шырока разгарнуць племянную гаспадарку. Ужо ў 1932 г. саўгас павінен здаць дзяржаве 629 племянных кныроў і 298 маладых сьвінаматак. Акрамя таго ўласнае стада саўгасу павінна ўзрасьці да 2.000 штук.

Аднак, саўгас з пастаўленымі перад ім задачамі ня справіўся. Саўгас, які меў добрыя паказальнікі ў мінулым, ня змог іх замацаваць. Кіраўнікі саўгасу, супакоіўшыся на сваіх дасягненьнях, не перабудавалі работы ў адпаведнасьці з разьвіцьцём буйнай племянной гаспадаркі. Цяперашні стан саўгасу характарызуе яго, як адстаючы. Адыходы дасягнулі нязвычайных разьмераў.

Як магло здарыцца, што саўгас, які быў адным з перадавых, аказаўся ў ліку адстаючых. Гэта — рэзультат няўменьня кіраваць па-новаму, няўменьня практычна рэалізаваць 6 умоў т. Сталіна.

Студзень — рашаючы месяц падрыхтоўкі да апаросаў — прайшоў у саўгасе з поўным спакоем. Дырэктар т. **Каваленка** знаходзіўся ў водпуску, сакратар парткалектыву т. **Калешко** быў у бесьперапынных разьездах, а зоатэхнік тав. **Фабрыстава** наогул спадзявалася на волю лёсу.

Але вось наступіў люты, сьвіньні не хацелі больш чакаць і пачалі парасіцца адна за другой. На працягу месяца 60 сьвінаматак прывялі 536 парасят.

Масавыя апаросы засталі гаспадарку зьнянацку. Сьвінарнікі не ацеплены, вэнтыляцыя не праведзена, рабочая сіла не падрыхтавана. Сьвінары і сьвінаркі мітусіліся па сьвінным гарадку, ня ведаючы, за што раней ўзяцца, ці прасушваць і дэзынфэкціраваць сьвінарнікі, ці прымаць апаросы. Сьпяшылі як на пажар. Усё прышлося рабіць адразу. А тут як на зло, сакавік прынёс яшчэ 553 парасят ад 70 сьвінаматак.

На сьвінарніках недахват рабочай сілы. Зоатэхнік мітусіцца па саўгасе і вельмі просіць кожнага хоць поч падзяжурыць.

Аб забесьпячэньні парасят малаком сваячасова не падумалі. Парасяты проста галадалі.

Дырэкцыя і парт'ячэйка цажынялі плёны сваёй бязьдзейнасьці. Сярод парасят пачаўся масавы падзёж. Значная частка іх была задушана маткамі з прычыны недагляду. Потым зьявіўся напос і параціф. На 20 красавіка пала 372 парасяты — 28 проц.

У трэцяй дэкадзе красавіка саўгас наведала новая бяда. Прыбыўшы з Менску ўпаўнаважаны Племтрэсту тав. **Руцько** катэгарычна патрабаваў правядзеньня неадкладнай прышчэпкі супроць чумы. Усе пярэчаньці дырэкцыі аб непадрыхтаванасьці стада, аб неабходнасьці адкласьці прышчэпку да выгану сьвіней на пашу не дапамаглі. Тав. Руцько, які дабіваўся «100 проц. выкананьня пляну», дзейнічаў рашуча і крута.

Бяз усякай папярэдняй падрыхтоўкі, пры наяўнасьці захворваньняў сярод парасят, прышчэпка была праведзена. Аб тым, як яна праводзілася, сьведчыць наступны факт. Прышчэпачная рэакцыя звычайна наступае на 4-5 дзень. Каб ня ўпусьціць гэты момант для сваячасовага ўліваньня сываратки, неабходна штодзенна праводзіць тэрмамэтраваньне стада. Але дырэкцыя не паклапацілася забясьпечыць сьвінарнікі на гэтыя дні неабходнай дадатковай рабочай сілай. На працягу 3-х дзён тэрмамэтраваньне не праводзілася. Аслабленыя парасяты пачалі дохнуць масамі. За тры дэкады пала яшчэ 516 штук. З 1.412 парасят на 20 мая пала 888.

20 мая, пасьля таго, як 62,8 проц. парасят ад веснавых апаросаў ўжо палі, у саўгас прыбывае дырэктыва з Масквы ад Племтрэсту адтэрмінаваць прышчэпку да выводу сьвіней на пашу і забясьпечыць загадзя стада павялічанай нормай кармоў. Камэнтары да гэтага дакументу лішнія.

Вынікі веснавых апаросаў у саўгасе «Івань» з усёй відавочнасьцю паказалі, што сьвінагадоўля, як асноўная галіна гаспадаркі, ня стала яшчэ ў цэнтры ўвагі дырэкцыі, партарганізацыі і камсамольскай ячэйкі. 17 камсамольцаў, якія працуюць на сьвінарніках, ня былі мабілізаваны на барацьбу за захаваньне веснавых апаросаў.

Аб гэтым гаворыць таксама той факт, што пастанова ЦК і СНК аб жывёлазагатоўках да 23 мая яшчэ ня была прапрацавана ў сьвінагадоўчым цэху, таксама, як і ва ўсім саўгасе.

Прапрацоўка пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб мясазагатоўках у сьвінагадоўчым цэху саўгасу «Івань» паказала, што рабочыя пры правільным кіраўніцтве трыкутніка, бязумоўна, справіліся-б са сваёй задачай.

У прынятых на сябе абавязацельствах сьвінагадоўчы цэх аднадушна парашыў:

— Каб не заставацца ў даўгу перад дзяржавай, дабіцца максымальнага захаваньня маладняка, што застаўся, а таксама ад надыходзячых асеньніх апаросаў. Падрыхтоўку да апаросаў сьвінагадоўчы цэх парашыў пачаць ужо зараз.

Чэрвень абвешчан месяцам аўладаньня тэхнікай, на працягу якога ўсе сьвінары павінны дэтальна вывучыць пытаньні захаваньня маладняка, кармленьня і догляду парасят. Асаблівую ўвагу сьвінары зьвярнулі на санітарны стан стада. Кожныя 10 дзён сьвінарнікі павінны дэзынфэкціравацца, раз у 2 тыдні праводзіцца мыцьцё ўсяго маладняка, а дарослых сьвіней раз у месяц.

Да пачатку апаросаў падсоснымі маткі павінны быць зазьбясьпечаны адпаведнымі кармамі, а парасяты малаком. Для забесьпячэньня сьвіней кармамі на зіму пастаноўлена дадаткова закласьці яшчэ адну сіласную яму.

Для вывучэньня вопыту перадавога племяннога сьвінсаўгасу «Блонь», які зазнаў веснавы апарос, сьвінары «Івані» парашылі накіраваць туды спэцыяльную брыгаду.

Перад арганізацыямі саўгасу пастаўлена рашучая задача — на аснове 6 гістарычных умоў т. Сталіна і прынятых самаабавязацельстваў у найкарацейшы тэрмін дабіцца карэннай перабудовы сьвінагадоўчага цэху.

Слуцкі раённы камітэт партыі павінен больш аддаваць увагі аднаму са сваіх важнейшых вучасткаў, а трэст Сьвінавод ад павярхоўнага гастралёрства павінен перайсьці да сапраўднага апэрацыйнага кіраўніцтва сьвінасаўгасамі.

Ударнікі «Зьвязды» і «Правды»: **Кулік Н., Гоман Я., Купрэйчык В., Хаванская А., Гурбо В., Гурбо Е., Пуціна М., Адамовіч М., Барысевіч М., Мурашка Х., Валынец А., Казёл Ш., Юркевіч К., Халімонюк Д., Гладко В., Кісель П., Яшын М., Адзярыха Т., Шчэлкун, Цыбулька Н., Гарук І., Грэскі Н.**

(Усяго 22 чал.).

24/V-32 г.

саўгас «Івань», Слуцкага раёну

БРЫГАДА „ІВАНІ" Ў САЎГАСЕ „БЛОНЬ"

Абмен вытворчым вопытам—лепшы сродак для аўладаньня тэхнікай сацыялістычнай сьвінагадоўлі

САЎГАС «БЛОНЬ», 28-V. (Па тэлефону ад нашага кар.).

27 мая ў сьвінагадоўчы цэх саўгаса **«БЛОНЬ»**, Пухавіцкага раёну, прыбыла брыгада сьвінароў з саўгасу **«ІВАНЬ»** (Случчына).

Мэта прыезду брыгады — азнаёміцца з практыкай арганізацыі працы і тэхнікай сьвінагадоўлі саўгасу «Блонь», які захаваў веснавыя апаросы.

На працягу двух дзён брыгада саўгасу «Івань» падрабязна знаёмілася і вывучала ўсе працэсы вытворчасьці і догляду стада. Брыгада прысутнічала пры кармленьні, пры выгане матак на прагулку, пры злучны.

28 мая адбылася вытворчая парада сьвінагадоўчага цэху саўгасу з удзелам іваньскай брыгады. Таварышы з «Івані» прызналі, што ў «Блоні» догляд і кармленьне пастаўлены значна лепш, чым у іх, а таму і вынікі тут атрымаліся зусім іншыя.

Напрыклад, у «Івані» на прагулку выпускаюць разам усіх сьвінаматак з парасятамі. Сьвінаркі не пасьпяваюць усіх дагледзіць і маткі часта душаць парасят. У «Блоні»-ж на прагулку выпускаюцца па 3 сьвінаматкі з парасятамі.

Сыстэма кармленьня як дарослых сьвіней, так і парасят у гэтых двух саўгасах таксама розная. У «Блоні» сьвіней корміць густой мяшанкай, а ў «Івані» балтушкай, якая дае мала карысьці.

Адрозьніваецца і сыстэма дзяжурстваў у матачных сьвінарніках. У той час, як у «Блонь» ўся ўвага накіравана на захаваньне апаросаў, у «Івані» — на «эканомію» рабочай сілы.

Вытворчая парада прызнала, што абмен вопытам арганізацыі вытворчасьці зьяўляецца лепшым сродкам для аўладаньня тэхнікай сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Азнаёміўшыся са становішчам у саўгасе «Івань», дзе загінула 62,8 проц. парасят ад веснавых апаросаў, вытворчая парада пастанавіла паслаць у гэты саўгас лепшых ударнікаў сьвінагадоўчага цэху — старшага сьвінара тав. **Васіну** і сьвінара тав. **Фэдарэнчыка** для таго, каб перадаць свой вытворчы вопыт у барацьбе за захаваньне веснавых апаросаў, за захаваньне 8 парасят ад кожнага апаросу.

28 мая ўвечары брыгада саўгасу «Івань» выехала з «Блоні».

Насустрач калгаснаму гандлю

МАБІЛІЗАВАЦЬ АДКІДЫ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

на павялічэньне выпуску тавараў шырокага спажываньня

Арганізацыя уцільцэхаў на мэталяапрацоўчых заводах—важнейшая задача

Апошнія пастановы партыі і ўраду аб збожжазагатоўках, мясазагатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю зьяўляюцца важнейшымі мерапрыемствамі, накіраванымі на паляпшэньне рабочага снабжэньня, на ўздым дабрабыту працоўных мас вёскі. Ільготы, якія прадастаўляюцца калгасам, калгаснікам і працоўным сялянам - аднаасобнікам як па лініі загатовак, так і гандлю, павінны значна павялічыць прыток с.-г. прадуктаў на рынак. Зразумела, што спадзявацца на самацёк у гэтай справе нельга. Тут патрэбна ня толькі сыстэматычная растлумачальная работа, але і вялізарная практычная дапамога калгасам у арганізацыі калгаснага гандлю.

Разгортваньне калгаснага гандлю ў сваю чаргу павялічвае попыт з боку калгаснікаў і аднаасобнікаў на фабрычна - заводзкія прадметы шырокага спажываньня. Адсюль на прамысловасьць і прамысловую кааперацыю зараз ускладаюцца адказьнейшыя задачы пашырэньня выпуску прадукцыі шырокага спажываньня.

Якія-ж крыніцы і рэсурсы ёсьць на прадпрыемствах для ажыцьцяўленьня гэтага заданьня? Перш за ўсё — гэта **рацыянальнае выкарыстаньне рознага роду уціль-адыходаў**, якія на многіх прадпрыемствах ёсьць у вялікай колькасьці. Вось чаму народны камісарыят цяжкай прамысловасьці СССР выдаў спэцыяльны загад аб максымальным выкарыстаньні адыходаў на прадпрыемствах шляхам пераапрацоўкі іх на прадметы шырокага спажываньня.

Белмэталяаб'яднаньне ў гэтым напрамку ўжо прыняло некаторыя меры. Усім мэталяапрацоўчым прадпрыемствам дана ўказаньне аб неадкладным выяўленьні ўсіх адкідаў і распрацоўцы канкрэтных мерапрыемстваў па іх выкарыстаньні на саміх прадпрыемствах шляхам арганізацыі спэцыяльных цэхаў і брыгад, якія-б былі заняты выключна на вытворчасьці прадметаў шырокага спажываньня.

Што канкрэтна можна вырабляць на мэталяапрацоўчых прадпрыемствах БССР з рознага роду уціль-адкідаў? Перш за ўсё — гэта гаспадарчыя рэчы для шырокага ўжываньня ў хатняй гаспадарцы селяніна — калгасьніка і аднаасобніка: вілы, утулкі, падоскі, падковы, вілкі, качэргі, трыножнікі, клямкі, шчаколды, засаўкі, малаткі, бабкі і інш.

Трэба адзначыць, што некаторыя заводы ўжо прыступілі да практычнай работы. Так, **«Чырвоны мэталіст»** (Віцебск) заключыў гаспадарчы дагавор з Белсельгасснабам на выраб 10.000 малаткоў і бабак для адбіваньня кос. Магілёўскі завод **«Адраджэньне»** прыступіў да вырабу з адкідаў завесаў для дзьвярэй і вокнаў. На заводзе **«Камунар»** (Менск) арганізавана брыгада з кавалёў, сьлесароў і бляшаньнікаў, якая гэтымі днямі прыступае да вырабу віл, падкоў, сякер, патэлец, завесаў, засавак, самаварных труб, бакалейных саўкоў, жароўняў і рад інш. рэчаў.

Пачын гэтых прадпрыемстваў павінен быць падхоплен ня толькі ўсімі мэталяапрацоўчымі заводамі, але і прадпрыемствамі іншых галін прамысловасьці. Узяць хаця-б **дрэвааапрацоўчую прамысловасьць.** На дрэвааапрацоўчых прадпрыемствах ёсьць вялікая колькасьць розных адкідаў, якія можна скарыстаць для вырабу хатняй мэблі (табурэтак, лавак, ложкаў), прылад для сьлясарна - цесьлярскіх інструмантаў (рубанкаў, піл і г. д.).

Асабліва адказныя задачы ў гэтых адносінах ускладаюцца на прамысловую кааперацыю, якая ўсю сваю работу павінна падначаліць вырашэньню пытаньня пашырэньня выпуску прадметаў шырокага спажываньня.

Фабрыка „Ўсход" выпускае бракаваную прадукцыю

Нядаўна камісія выканаўчага прыкладу СНК БССР абгаварыла пытаньне аб затаварваньні скурана-галянтарэйнай фабрыкі «Ўсход» гатовай прадукцыяй.

На 10 мая на фабрыцы скапілася перэалізаванай прадукцыі на 800.000 руб. Апрача таго, у дарозе ёсьць невыкупленых тавараў на 700.000 руб. Усяго перэалізавана гатовай прадукцыі на 1.500.000 руб., што складае больш 50 проц. фактычнага выпуску прадукцыі за 4 месяцы гэтага году.

Камісія выканаўчага прыкладу СНК БССР прызнала асноўнымі прычынамі затаварваньня дрэнную якасьць прадукцыі і слабае плянаваньне вытворчасьці і рэалізацыі.

Загадчыкі паасобных цэхаў—т. т. **Гурвіч, Нісэнбаум** дапусьцілі выпуск нядобраякаснай прадукцыі, бракераж фабрыкі нядбайна адносіўся да кантролю за якасьцю. У выніку масамі выпускалася бракаваная прадукцыя, пры чым на асобных асартымэнтах брак дасягнуў недапушчальна высокіх разьмераў (стандарт № 2—партфэлі—62 проц., стандарт № 10—партмапэ—50 проц.). Загадчык аддзелу тэхнічнага кантролю фабрыкі тав. **Маргенштэйн** не змагаўся з выпускам дрэннай прадукцыі, а дырэктар фабрыкі тав. **Матусевіч** ня прыняў мер да наладжаньня работы аддзелу тэхнічнага кантролю і да паляпшэньня якасьці. Дырэкцыя фабрыкі і беларуская кантора «Саюзскурсбазбыту» праявілі поўную бязьдзейнасьць у арганізацыі плянаваньня вытворчасьці і рэалізацыі прадукцыі, у сувязі з чым выпрацоўваліся асартымэнты, не прадугледжаныя спэцыфікацыі, на якія німа вялікага попыту. Значная частка адгружанай прадукцыі зьвернута пакупцамі з-за іх дрэннай якасьці, нездавальняючага асартымэнту і засылкі без заказаў і разнарадак. Частка тавараў [illegible] зберігана фабрыкай на месцы [illegible] ці да 40 проц. супроць вызначаных цэн.

Камісія выканаўчага прыкладу прапанавала прокурору рэспублікі зрабіць тэрміновае расьсьледваньне і прыцягнуць да адказнасьці асоб, якія дапусьцілі затаварваньне і выпуск браку. Народнаму камісарыяту лёгкай прамысловасьці даручана прыняць меры для поўнай рэалізацыі гатовай прадукцыі фабрыкі «Ўсход».

Уціль—крыніца новых рэсурсаў

Вялікі ўздым матар'яльнага дабрабыту шырокіх працоўных мас патрабуе няўхільнага разгортваньня вырабу прадуктаў шырокага спажываньня і ў сувязі з гэтым, дадатковых сырцовых рэсурсаў.

Дзесяткі тысяч тон уціля, што раскіданы па звалках і хлявох зьяўляюцца невычарпальнай крыніцай новых рэсурсаў сырцу.

Тав. ПАНЦЕЛЕЯЎ — лепшы ўдарнік аддзелачнага цэху віцебскага шчацінна-жамбінату, які выконвае прамфінплян на 160 проц.

Шэрсьцянае і суконнае рызьзё, якое ператвараецца на фабрыках у штучную воўну і дае дадатковую колькасьць тканіны, у вялізарнай колькасьці валяецца на звалках. Мы выкідваем маленькія кавалкі рызьзя (браку), ня ведаючы, што гэтым мы зьмяншаем выпрацоўку дэфіцытнага дахавага матар'ялу (толю).

Мы спакойна зьнішчаем макулятуру (папяровы зрыў), бавоўняна - папяровае рызьзё, якое зьяўляецца асноўным сырцом для папяровай прамысловасьці, між тым нашы культурныя ўстановы і школы адчуваюць вострую патрэбу ў паперы, сшытках і падручніках.

Выкідваючы косьці, мы забываем аб тым, што яны ідуць на выраб угнаеньня для палёў, на выраб кіно-плёнкі, касьцянога вугалю, што ўжываецца для рафінаваньня ў цукровай прамысловасьці.

У 1931 годзе заводамі Саюзу было выпушчана 50 мільёнаў пар галёш. Аднак, гэта колькасьць не здавальняе патрэб насельніцтва. Вытворчасьць галёш трэба пашырыць. Абутковыя фабрыкі мелі прастої з-за недахопу гумовай падэшвы. Аўтатранспарт патрабуе новых шын і камэр. Мы ня можам сабе дазволіць роскаш імпартаваць тысячы тон каўчуку.

Старая гума, якая ў нас ёсьць (старыя галёшы, гумавыя прыпады) пасьля рэгенэрацыі можа з посьпехам замяніць імпарт. Яе трэба сабраць і накіраваць у прамысловасьць. Тоны гумавага уцілю — гэта тысячы новых галёш, новых аўта-шын, камэр і гумавых падэшваў.

Дагэтуль мясцовыя арганізацыі і працоўнае насельніцтва мала цікавіліся пытаньнем збору уцілю; адсюль самацёк у загатоўчай рабоце, адсюль недавыкананьне пляну. У 1931 годзе па БССР не сабрана 5.000 тон рызьзл, што ў пераводзе на грошы складае мільён руб. А колькі гатовай прадукцыі недаатрымалі працоўныя з-за зьнішчэньня гэтага ўцілю.

Прамысловасьць патрабуе новых дадатковых рэсурсаў. Яна прад'яўляе сацыялістычны рахунак да уціньзагатоўчых арганізацый.

«Саюзуціль» разам са спажывецкай і прамысловай кааперацыяй БССР абвясьцілі двухмесячнік штурму ў мэтах выкананьня гадовага пляну да 1-га жніўня. На дапамогу загатоўчым арганізацыям павінна прыйсьці пралетарская грамадзкасьць. Піянэры, школьнікі, жанкі, камсамольскія арганізацыі, рабселькоры, ваш абавязак дапамагчы загатоўшчыкам уцілю, арганізаваць збор лёгкіх ў дамох, на прадпрыемствах, у калгасах.

Рахунак прамысловасьці павінен быць аплачан!

А. Румянаў.

КРУТА ЎЗЬНЯЦЬ ТОРФАЗДАБЫЧУ!

Заводы „Бальшавік", „Шлях сацыялізму" і Асінторф, ад тэмпаў вашай работы залежыць пасьпяховае завяршэньне вытворчай праграмы, пакажэце ўзоры барацьбы на тарфяных палёх!

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

ЗА ШТОДЗЕННАЕ ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ТЭМПАЎ ТОРФАЗДАБЫЧЫ, ЗА МАБІЛІЗАЦЫЮ МАС НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЗАНОСІМ НА ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ ТОРФЗАВОД **«ЗАКРАШЫНСКІ МОХ»**, ЯКІ ДА 26-ГА МАЯ ВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ НА 60,7 ПРОЦ. І **«ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНЬНІК»** — НА 67,8 ПРОЦ.

ЧОРНАЯ ДОШКА

За недапушчальна нізкія тэмпы здабычы торфу, за зусім нездавальняючую арганізацыю мас тарфяньнікаў на выкананьне пляну, за дрэнную расстаноўку рабочай сілы заносім на чорную дошку наступныя торфазаводы:

Па Белторфаб'яднаньні

«Чырвоны сьцяг», які да 26 мая выканаў толькі 9,6 проц. заданьня на гэты час; **«Бальшавік — 14,4 проц., «Смалявічы» — 22,7 проц.**

Па Наркамлёгпраму

«Камунар», які на 22 мая выканаў толькі 11,4 проц. заданьня на гэты час; **«Чырвоны Кастрычнік» — 19,2 проц.**

***

Начальцатам на чорную дошку заносім торфзавод Асінторф, які на 26 мая выканаў толькі 30,7 проц. заданьня. Гэты завод, выклікаўшы на сапраборніцтва астатнія заводы, на здолеў да гэтага часу мабілізаваць [illegible] рабочых-тарфянікаў на рэалізацыю [illegible] ўзятых [illegible] абавязацельстваў.

Раўняцца па брыгадзе тав. Бычкова

Брыгада тав. **Бычкова** складаецца з 25 чал., як і ўсе астатнія брыгады торфзаводу **«Закрашынскі мох»**. Яе сутачнае заданьне — 38 тыс. цаглін — па сваёй велічыні таксама нічым не адрозьніваецца ад заданьняў іншых брыгад.

У першыя дні сэзону яна давала зусім незначную выпрацоўку торфу. Тлумачылася гэта тым, што брыгада складаецца ў пераважнай сваёй частцы з навічкоў, якія на здабычы торфу працуюць першы год.

Але па меры кваліфікацыі іх і асваеньня тэхнікі працэсу вытворчасьці, брыгада шпаркімі тэмпамі стала гнаць угару крывую торфаздабычы.

Спаборнічаючы з камсамольскай брыгадай тав. Буйневіча, якая 24 мая выпрацавала 38.000 цаглін, або 100 проц. заданьня, **брыгада тав. Бычкова 25 мая замест плянавых 38.000 цаглін дала 42.000.**

На скліканым з поваду гэтага па другі дзень лятучым мітынгу рабочых усяго заводу, брыгада **тав. Бычкова была прэміявана за ўдарныя тэмпы работы.** Тут-жа брыгадзір тав. Бычкоў, пад гучныя воплескі ўсіх рабочых запэўніў ад імя брыгады адміністрацыю і партыйна - прафэсыянальную арганізацыю заводу, што ўзятых тэмпаў яны не здадуць. **Адначасова брыгадай выкуплены сустрэчны ў кольнасьці 12.000 цаглін звыш плянавага заданьня.**

Зараз брыгада змагаецца за 50.000 цаглін у суткі. Яна выклікала на сапраборніцтва ўсе астатнія брыгады заводу. У мэтах падтрыманьня ініцыятывы брыгады **тав. Бычкова** і мабілізацыі мас на пасьпяховае выкананьне пляну торфаздабычы, трыкутнік заводу абвясьціў унутрызаводзкі конкурс на лепшую брыгаду. У якасьці премії вызначан пераходны чырвоны сьцяг.

Бар—коў.

Здабыча торфу заводамі Балторфаб'яднаньня

НАЗВА ЗАВОДУ	Проц. вык. дзённ. заданьня за 26-У	Проц. вык. на лінію пляну
«Закрашынскі мох»	77,1	60,7
Імя Даўмана	50,0	39,3
«Свабода»	43,6	30,1
Імя 1-га мая	27,4	31,7
Смалявічы	27,0	22,7
«Шлях сацыялізму»	25,8	28,3
«Чырвоная Беларусь»	23,0	27,0
Асінторф	22,9	30,7
«Чырвоны сьцяг»	14,1	9,6
«Бальшавік»	—	14,4
Разам:	23,3	26,6

УВАГА: «Бальшавік» за 26 мая вестак ня прыслаў.

Ліквідаваць абязьлічку ў кормаздабываньні

Калі гавораць аб мясной праблеме, вельмі часта забываюць, або проста моўчкі абыходзяць важнейшае пытаньне, ад вырашэньня якога залежыць далейшае разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Гутарка ідзе аб стварэньні ўласнай устойлівай кармовай базы.

Як гэта ня дзіўна, але многія нашы гаспадаркі дагэтуль часта прадаўляюць злачынае раўнадушша да стварэньня ўласнай кармовай базы, пры гэтым зусім забываюць, што кармовая база—гэта жыцьцёвы нэрв сацыялістычнай жывёлагадоўлі, што кормаздабываньню павінен быць - забясьпечан размах адпаведны патрэбнасьцям стада.

Нельга абыйсьці і той факт, што рад нашых арганізацый усё яшчэ робяць стаўку на завоз кармоў і не скарыстоўваюць поўнасьцю ўсе магчымасьці для таго, каб пазбавіць жывёлу ад недаяданьня, а транспарт—ад лішніх перавозак.

Возьмем напрыклад **Белмалакопрамтрэст**, які мае ў БССР 75 саўгасаў з 30-тысячным стадам рагатай жывёлы.

Здавалася-б, што пытаньне кормаздабываньня павінна было займаць цэнтральнае месца ў рабоце трэсту. На справе-ж, у апараце, дзе працуе 14 агранамаў і жывёлаводаў, дагэтуль няма чалавека, адказнага за кармовую базу. Бачыце, «не хапае людзей».

Саўгасы Малакопрамтрэсту маюць усе магчымасьці для таго, каб забясьпечыць сябе поўнасьцю грубымі і сакавітымі кармамі і на 75 проц. канцэнтраванымі. Што-ж практычна зроблена для таго, каб ажыцьцявіць гэта.

Распрацавана... інструкцыя, якая далей трэстаўскіх канцылярый не прасунулася. І ўсё.

Сілас — каштоўнейшы сакавіты корм для рагатай жывёлы—займае значнае месца ў кармовым балансе саўгасаў. У гэтым годзе неабходна дабіцца, каб на кожную штуку рагатай жывёлы прыпадала ня менш 3,5 тон сіласу. І вось саўгасам дагэтуль яшчэ не разасланы плян сіласаваньня. Ён яшчэ распрацоўваецца. Тое-ж і з сенапаўборкай. Перад саўгасамі не пастаўлена рубам пытаньне, што яны самі ва што-б там ні стала павінны забясьпечыць сябе кармамі.

Наркамзем, на якога партыя ўскладала кіраўніцтва і рэгуляваньне пытаньнямі стварэньня кармовай базы, да апошняга часу (паводле прызнаньня саміх-жа працаўнікоў Наркамзему) не аддаваў гэтаму адпаведнай увагі. З восені мінулага году кармовы сэктар Наркамзему наогул быў ліквідаваны. І толькі нядаўна, пад напорам жыцьця зноў адноўлены.

У мінулым годзе рад саўгасаў і калгасаў паказалі ўзоры барацьбы за **стварэньне ўласнай кармовай базы** шляхам сваячасовай уборкі сенажаці і перавыкананьня пляну сіласаваньня. Але што зроблена Наркамземам і Калгасцэнтрам БССР для таго, каб вывучыць вопыт перадавых і перадаць яго ўсім жывёлагадоўчым саўгасам і калгасам.

Дарэмны будуць усе нашы намаганьні ні знайсьці хоць якія-небудзь лічбы і факты, што абагульвалі-б гэты вопыт. Ні ў Наркамземе, ні ў Калгасцэнтры іх няма.

«У нас нярэдка думаюць, што кіраваць—гэта значыць падпісваць паперы. А вось, каб паглыбіцца ў справу, аўладаць тахнікай, стаць гаспадаром справы,—пакуль гэтага—ні-ні» (Сталін).

Гэта вытрымка з выступленьня тав. Сталіна на 1-й усесаюзнай канфэрэнцыі работнікаў сацыялістычнай прамысловасьці, як нельга лепш падыходзіць да характарыстыкі работы апарату Наркамзему і Калгасцэнтру БССР.

Саюзным урадам у студзені даны былі дырэктывы аб стварэньні кармовай базы для сьвінагадоўчых калгасных фэрм, аб вылучэньні дадатковых плошчаў пад кармовыя культуры і пашу для гэтых фэрм.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове аб прымусовым аграмаджаньні жывёлы ад 26 сакавіка прапанаваў усім партыйным, савецкім і калгасным арганізацыям «арганізаваць дапамогу і садзейнасьць калгаснікам, якія ня маюць кароваў або дробнай жывёлы, у купле і гадаваньні маладняка для асабістых патрэб». Гэта значыць, што калгасы павінны забясьпечыць кармамі ня толькі аграмаджанае стада і калгасныя фэрмы, але і жывёлу, якая знаходзіцца ў карыстаньні калгаснікаў.

Што-ж зрабілі Наркамзем і Калгасцэнтр для таго, каб практычна ажыць цяпіць гэтыя важнейшыя дырэктывы партыі і ўраду? Сьпісалі шмат паперы. І толькі. Як гэтыя дырэктывы праламляюцца ў жыцьцё ў раёне, у калгасе—Наркамзем і Калгасцэнтр ня ведаюць.

БССР ужо трэцюю дэкаду вядзе масавую сяўбу. Перадавыя саўгасы і калгасы ўжо рапартуюць партыі аб датэрміновым сканчэньні сяўбы. Аднак, ход сяўбы кармовых і сіласных культур па рэспубліцы яўна нездавальняючы.

БССР у гэтым годзе, паводле вызначанага пляну, павінна засеяць 30.000 га сіласных культур. Усяго на 25 мая засеяна 9,3 проц. кармовых коранаплодаў і сіласных культур і 17,4 проц. аднагадовых траў. Нават раёны паўдзённай зоны засеялі ўсяго 13 проц. коранаплодаў і сіласных і 13,4 проц. траў. Такія раёны як **Любаньскі, Чачэрскі, Уваравіцкі, Рэчыцкі, Парыцкі, Нараўлянскі** засеялі ўсяго ад 2 да 6 проц. сіласных і коранаплодаў.

Зусім нездавальняюча праходзіць сяўба сіласных і кармовых культур па саўгасах. Саўгасы **Сьвінаводу** на 25 мая засеялі ўсяго 280 га (13 проц.) сіласных. Кармовых траў засеяна 1.486 га (14,3 проц.), пад выпасы засеяна 26 проц. вызначаных плянам. Ня лепш і па саўгасах **Малакопрамтрэсту**, якія засеялі 24 проц. коранаплодаў і 14 проц. сіласных.

Гэтыя лічбы з усёй відавочнасьцю паказваюць, што антысіласныя настроі, якія мы мелі ў мінулым годзе, яшчэ не ліквідаваны, што саўгасы і калгасы БССР яшчэ не разгарнулі сапраўднай барацьбы за стварэньне ўласнай кармовай базы.

Работнікі на мясцох зусім забываюць, што кожны гэктар пасеву сіласных культур, кожны гэктар пашы і сенажаці прыносіць поўную колькасьць літраў малака, кілёграмаў сьвіны і мяса, зусім ня ўлічваюць, што кожны дзень спазьненьня сяўбы кармовых і сіласных—гэта страчаныя тоны кармоў. Усё гэта вынік абязьлічкі ў справе арганізацыі кармовай гаспадаркі ў саўгасах і калгасах.

Для таго, каб у канцы другой пяцігодкі забясьпечыць у асноўным вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы, як гэта пастаўлена XVII усесаюзнай канфэрэнцыяй УсеКП(б), неабходна ў гэтым годзе дабіцца карэннага пералому ў тэмпах работ па стварэньні кармовай базы, дабіцца яснага разуменьня таго, што мерапрыемствы па кормаздабываньні ў калгасах і саўгасах патрабуюць спэцыяльнай увагі і сіл. З абязьлічкай у гэтай справе, якая яшчэ пашуе як у цэнтральных, так і раённых арганізацыях, пара раз назаўсёды пакончыць. У кожным саўгасе і калгасе павінен быць вылучан чалавек, які непасрэдна нясе адказнасьць за стварэньне кармовай базы, за сваячасовы засеў і ўборку кармовых культур і рацыянальнае скарыстаньне кармоў.

У гэтым годзе выключную ўвагу трэба аддаць сенаўборцы. На БССР паводле пляну трэба скасіць 1.850.000 га натуральных сенажацяй і каля 375.000 сеяных. Пашырэньне плошчаў натуральных сенажацяй паралельна з мінулым годам невялікае. Усю справу будзе вырашаць ураджайнасьць і агратэхніка. Мерапрыемствы па паляпшэньні лугоў (як зрэзка кустоў, высяканьне хмызьняка) значна павышаюць ураджайнасьць іх. Сваячасовая ўборка сенажаці таксама дасьць дадатковыя сотні тысяч тон бялка, дасьць магчымасьць у радзе раёнаў зьняць другі ўкос.

Не чакаць «пятрова дня», як гэта яшчэ робяць многія нашы калгасы, а пачынаць касьбу ў пачатку цьвіценьня пераважнай часткі травастою — баявая задача кожнага саўгасу і калгасу. Гэтым мы з'эканомім 30-40 проц. сена на якасьці яго і столькі-ж па колькасьці.

Падрыхтоўка цягавай сілы і інвэнтару, правільная арганізацыя рабочай сілы тут маюць рашаючае значэньне. Саўгасы ўжо зараз павінны прыступіць да арганізаванага набору рабочай сілы на час сенаўборкі шляхам заключэньня адпаведных дагавораў з калгасамі.

Калгасная сыстэма павінна забясьпечыць добраякаснымі кармамі ня толькі аграмаджанае стада, але і жывёлу, якая знаходзіцца ва індывідуальным карыстаньні калгаснікаў. Гэта зусім магчыма зрабіць за кошт сваячасовай уборкі лясных і балотных сенажацяй.

Пры адводзе сенажацяй ні ў якім разе нельга забываць пра беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў, якія адыгрываюць значную ролю ў выкананьні пляну мясазагатовак і мясным гандлі.

Толькі канкрэтнымі мерапрыемствамі па стварэньні ўстойлівай кармовай базы мы павінны ацэньваць уменьне і гатоўнасьць цэнтральных і раённых арганізацый, паасобных саўгасаў і калгасаў на справе змагацца за вырашэньне мясной праблемы, за разгортваньне мясазагатовак і мясного гандлю.

Зорын.

Улік—неадлучная частка сацыялістычнага будаўніцтва

(Гутарка з нач. кіраўніцтва народна-гаспадарчага ўліку БССР тав. СТРАКОЎСКІМ)

**На падставе палажэньня СНК СССР аб органах народна-гаспадарчага ўліку арганізавана цэнтральнае кіраўніцтва народна-гаспадарчага

ШКВАЛАМ ДЭМАНСТРАЦЫЙ ПРАТЭСТУ

спынім паход польскага фашызму супроць ТБШ

УСЕ НА ДАПАМОГУ ЗАХОДНЯ-БЕЛАРУСКІМ БРАТОМ ПА КЛЯСЕ

Пратэстрабочых „Дняпроўскай мануфактуры“

Мы—паўтаратысячная армія рабочых фабрыкі «Дняпроўская мануфактура», давядаўшыся аб разыюшаным паходзе польскага фашызму супроць нацыянальна-вызваленчага руху працоўных Зах. Беларусі, **выносім рашучы пратэст і ганьбім зьдзічэлых «цывілізатараў»-пілсудчыкаў.**

Жудасныя дні плывуць над Зах. Беларусьсю. Такіх дзён яшчэ ня бачыла гісторыя.

Там загнана ў глыбокае падпольле ня толькі КПЗБ—загартаваны ў рэвалюцыйных баёх правадыр рабочых і сялян. **У «дэмакратычнай» Польшчы і мова беларуская лічыцца нелегальнай.**

Польскі фашызм так «вырашыў» нацыянальнае пытаньне, што зараз ні **аднэй беларускай школы не застанецца там,** дзе беларусы складаюць **абсалютную** большасьць насельніцтва. **Лік відуючы ТБШ, паны забараняюць нават змагацца за школу на роднай мове.**

Але недачаканьне ваша, каты і душыцелі Заходняй Беларусі! Вы разграмілі Грамаду, кінулі за краты тысячы лепшых грамадаўцаў, але вам не ўдалося задушыць рэвалюцыйнага гневу падняволеных краіны, не ўдалося зламаць магутнай з дня на дзень нацыянальна-вызваленчай барацьбы рабочых і сялян.

Ня ўдасца вам гэта і цяпер. Ваш азьвярэлы «паход» супроць беларускага школьніцтва і ТБШ выкліча ня толькі новую хвалю нянавісьці і абурэньня. Ён выкліча новы шквал рэвалюцыйнай барацьбы.

На тэрор і нацыянальны ўціск мы адказваем 100-процантным уступленьнем у рады МОПР'у і хваляй творчага энтузіязму.

Прэч рукі ад ТБШ!

Далоў крывавых акупантаў

Ганьба прадажнікам—Луцкевічу і Астроўскаму!

Няхай жыве рэвалюцыйная барацьба рабочых і сялян супроць акупацыі!

Няхай жыве КПЗБ!

Разгром ТБШ—крок наперад у падрыхтоўцы інтэрвэнцыі

Абрабаваныя, прышпечаныя, пазбаўленыя мінімальных умоў для свайго існаваньня, **працоўныя Заходняй Беларусі** з вялікімі для сябе ахвярамі змагаюцца за права хоць-бы гаварыць па сваёй роднай мове.

Польскі фашызм разгромам ТБШ пазбаўляе працоўных Заходняй Беларусі нават гэтага іх права.

У той час, калі **Савецкая Беларусь** ужо два гады як увяла **ўсеагульнае навучаньне, зараз ліквідавала няпісьменнасьць дарослага насельніцтва,** працоўныя Заходняй Беларусі, пад крывавым ботам акупантаў, пазбаўлены нават мізэрнай асьветы, нават тых пекальких школ, якія створаны ТБШ. І ў гэтай агіднай справе душэньня працоўных Заходняй Беларусі, дзейны ўчэд прымаюць беларускія нацыянал-фашысты п. п. Астроўскія, Луцкевічы, Акінчыцы і К°.

Польскі фашызм ня спыняецца ні перад чым, каб забясьпечыць сабе тыл для нападу на Савецкі саюз.

Супрацоўнікі Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі з абурэньнем пратэстуюць супроць гэтага нячуванага зьдзеку над працоўнымі Заходняй Беларусі.

— Мы ўпэўнены, што працоўныя Заходняй Беларусі яшчэ мацней згуртуюцца навакол КПЗБ з тым, каб пад сьцягамі гэтага адзінага абаронцы працоўных здабыць сабе права на хлеб і волю, навуку і культуру, здабыць дыктатуру пралетарыяту.

Правакацыйнае антысавецкае выступленьне

японскай рэакцыйнай газэты

ТОКІЁ. Блізкая да кіраўня правых газэта «Ніхон» закагтае сэрыю артыкулаў «экспэрта на рускім пытаньні» Камаіці апублікаваньнем заключнага артыкулу пад загалоўкам: **«Япона-амэрыканская або япона-савецкая вайна».**

Асноўная мысьль артыкулу зводзіцца да наступнага: Амэрыка, якая была наступнікам Японіі ў пачатку эпохі Мейдзі (2-я палова XIX стагодзьдзя) стала канкурэнтам Японіі на Далёкім Усходзе і, пачынаючы з портсмуцкага міру, аказвала ўсялякі напіск на Японію, у прыватнасьці на вашынгтонскай і лёндонскай канфэрэнцыях, а таксама шляхам увядзеньня закону, які абмяжоўвае японскую іміграцыю. У рэзультаце гэтага сярод упліывовых японскіх колаў узмацнілася пільнь, што сталася за паскарэньне вайны з Амэрыкай, тым больш, што пасьля 1935 г. становішча Японіі аказацца ў адносінах Амэрыкі значна менш выгодным.

Камаіці абвяргае гэты пункт гледжаньня, бо, паводле яго думкі, у выпадку япона-амэрыканскай вайны можа пасьледваць «супрацоўніцтва паміж ПАЗШ, УсеКП(б) і Кітаем».

Нават сустрэча «адзін на адзін» з Амэрыкай, піша аўтар, не абяцае надзеі на перамогу, паколькі ваенная перамога над флётам ПАЗШ ня будзе суправаджацца перамогай у эканамічнай вайне, хоць і ў гэтым выпадку «ПАЗШ ня змогуць нанесьці канчатковае паражэньне Японіі з прычыны наяўнасьці падзяляючага іх Ціхага Акіяну».

Камаіці ўказвае далей, што кітайскі фактар зьяўляецца асноўнай прычынай супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Японіяй. Таму неабходна «дабіваца кампрамісу ў выглядзе падзелу кітайскага рынку паміж ПАЗШ і Японіяй».

«Гэта задача, — указвае аўтар, — ня лёгкая, але поўнасьцю можа быць вырашана, калі ўлічыць супярэчнасьць супярэчнасьцей паміж ПАЗШ і Англіяй, а таксама настрой амэрыканскіх бавоўнікаў, якія не жадаюць траціць японскі рынак».

Зусім інакш стаіць справа з японасавецкай вайной, — піша далей аўтар. Паміж Японіяй і СССР ня можа быць дружбы, бо «іх ідэалы дыямэтральна процілеглыя».

— «Японія — манархія, якая дабіваецца мірнага ажыцьцяўленьня і захаваньня ўзаемных інтарэсаў народаў сьвету. СССР-жа — рэспубліка, якая імкнецца да беспарацкаў, грамадзянскай вайны і рэвалюцыі і якая імкнецца таксама да падпачаленьня ўсяго сьвету».

Грамадзкая думка Японіі, указвае Камаіці, скансэрвавана зараз на Манчжурыі і Манголіі. Аднак, «да вырашэньня савецкага пытаньня ня можа быць і гутаркі аб стварэньні раю ў Манчжурыі». Вырашэньне-ж манчжурска-манголькай праблемы залежыць, паводле слоў Камаіці, ад вырашэньня сібірскай праблемы. «Манчжурская дзяржава павінна вырашыць сібірскую праблему, інакш яна аказацца пад пагрозай, якая ідзе з боку сібірскіх межаў: унутры-жа КУЧ застанецца пагрозай, якая перашкаджае ўмацаваньню манчжурскай дзяржавы. Нельга даць ашукаць сябе салодкімі гуткарамі СССР».

Вырашэньне сібірскай праблемы азначае «дапамогу сібірскаму народу, які насяляе раён на ўсход ад Байкалу, у ажыцьцяўленьні незалежнасьці і ўстанаўленьні ў Сібіры прынцыпу адкрытых дзьвярэй для ўсяго сьвету».

«Японія, — працягвае Камаіці, — страшэнна баіцца грамадзкай думкі ПАЗШ, Англіі і іншых дзяржаў. Але па сутнасьці яхто з іх не пярэчыць супроць палітыкі Японіі ў Сібіры. Японія дапамагла манчжурскаму народу дабіцца незалежнасьці. УсеКП(б) — агульны вораг усяго сьвету. Таму няма чаго баяцца, што хто-небудзь будзе пратэставаць супроць незалежнасьці Сібіры». Краіны, што мяжуюць з СССР, піша далей Камаіці, падрыхтоўваюць антысавецкі блёк.

Маючы незалежную Сібір, разьвівае свае пляны токійскі чорнасоценец-інтэрвэнт, Японія «забясьпечыць поўную эканамічную незалежнасьць ад рэшты сьвету. Пры падтрымцы Манчжурыі, Манголіі і Сібіры Японіі няма чаго баяцца, нават калі ўрэсь сьвет паўстане супроць яе». У раёне адной толькі Ўсурыйскай чыгункі можна атрымаць штогодна 30 млн. коку рысу. Усходняя Сібір багата золатам, жалезам, лесам, рыбай, вугалем і ўраджайнай глебай. Атрымаўшы Сібір, Японія на векі вякоў забудзе аб беспрацоўі і эканамічных крызісах. Незалежнасьць Сібіры азначае, што Японія адным ударам заб'е ня двух, а пяць зайцаў.

У Японіі, піша далей Камаіці, шмат гавораць аб фашызьме, але ніякі фашызм не дапамажа Японіі. Адзіны сродак дапамагчы Японіі — гэта адкрыць дзьверы Сібіры. Цяпер—лепшы час для ажыцьцяўленьня гэтай праграмы. Нельга ўпусьціць момант, які можа ніколі ня вернецца».

Нарэшце, Камаіці заўважае, што замах у Шанхаі зроблен «карэйцам — марыянэткай УсеКП(б) і інсінуе, што рад замахаў на КУЧ — «справа рук рускіх камуністаў».

«Няўжо цяпер, — гаворыць Камаіці, — японская ўлада праявіць хістаньне і не адважыцца прыняць адпаведныя меры ў сувязі з крушэньнем 12 красавіка, з-за боязьні перад магутнасьцю савецкай Чырвонай армії!»

«Чым хутчэй ажыцьцявіцца праграма супроць СССР, тым лепш», — такі заключны акорд гэтага выключна наглага і правакацыйнага артыкулу надэмнага борзапісца найбольш авантурыцкіх колаў японскага імпэрыялізму. (ТАСС).

ПОЛЬСКІЯ САЛДАТЫ І МАТРОСЫ АДМОВІЛІСЯ СТРАЛЯЦЬ У РАБОЧЫХ

Крывавыя падзеі ў Гдыні

БЭРЛІН, 28. Ня гледзячы на абвяржаньне польскага друку, «Бэрлінэр Бэрзэн Цэйтунг» зноў пацьвярджае свае паведамленьні аб хваляваньнях і крывавых падзеях на тэрыторыі «польскага калідору». Газэта падае падрабязнасьці падзеяў, якія мелі месца на мінулым тыдні ў Гдыні. **Партовыя рабочыя ў Гдыні, якія павінны былі грузіць агнянебясьпечныя і шкодныя для здароўя газы, што адпраўляліся хэмічкай фабрыкай у Хажове на Далёкі Ўсход, абвясьцілі забастоўку. Забастоўка была непасрэдна выклікана выпадкамі цяжкага атручаньня рабочых газамі пры пагрузцы,** а таксама адмаўленьнем кіраўніцтва порту павысіць зарплату і скасаваць паліцэйскі нагляд у часе работы. Рабочыя кінулі работу 1, паладзіўшы дэманстрацыю, пакіраваліся да дому камэнданта порту. З прычыны таго, што камэндант адмовіўся гутарыць з рабочымі і выклікаў войска, **рабочыя выбілі вокны і прабавалі разграміць камэндатуру. Польскія матросы,** а таксама **салдаты, размешчанага ў Гдыні 2-га палка ўланаў, адмовіліся страляць у рабочых.** Толькі пры дапамозе выкліканага атраду морскіх кадэтаў і жандараў дэманстрацыя была разагнана, пры чым **двое рабочых былі забіты і звыш 30 цяжка паранены.** Пасьля гэтага, камэндант порту абвясьціў порт на ваенным становішчы, забараніў забастоўку і распусьціў прафсаюз партовых рабочых. Ня гледзячы на гэта, пераважная частка рабочых ня спыняла забастоўкі. Пагрузка праводзілася сіламі легіянэраў і іншых ваенных арганізацый. (ТАСС).

Пленум ЦК германскай кампартыі

Кампартыя паказвае шлях барацьбы супроць фашызму

Узмацніць наступленьне супроць клясавага ворага

БЭРЛІН, 27. У Бэрліне адбыўся пленум ЦК германскай кампартыі, на якім прысутнічалі сакратары раённых партыйных арганізацый. Пленум абмеркаваў палітычнае становішча і бягучыя задачы партыі.

Тав. ТЭЛЬМАН пасьля кароткага аналізу клясавых суадносін сіл, якія знайшлі сваё адлюстраваньне ў нядаўніх выбарах, зрабіў асноўныя вывады аб палітыцы партыі і аб задачах рэвалюцыйнага руху ў цэлым.

Тав. Тэльман указаў на нязвычайны рост шавіністычнай і нацыяналістычнай хвалі ў Германіі, якая знайшла сваё выяўленьне ў значным росьце гітлераўскай партыі і якая **ПАТРАБУЕ АД РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ БОЛЬШ РАШУЧАГА АДПОРУ І БОЛЬШ ЗНЭРГІЧНАГА КОНТРНАСТУПЛЕНЬНЯ.** Нацыяналістычнаму ўкаванню і дэмагогіі гітлераўскага фашызму партыя павінна **в большай рашучасьцю процідаставіць** сваю праграму і пастановы Цэнтральнага Камітэту і растлумачыць масам волю кампартыі, як адзінай партыі, якая вядзе рашучую барацьбу супроць взрэальскага рабства.

Неабходна канстатаваць, што партыі не ўдалося выкарыстаць у поўнай меры тыя магчымасьці, якія былі закладзены ў об'ектыўных умовах. Партыя павінна шляхам самакрытыкі ўявіць сабе, што на важнейшых вучастках рэвалюцыйнай масавай работы ёсьць буйныя недахопы, якія павінны быць ліквідаваны ва што-б там ні стала.

Гутарка ідзе не аб павароце лініі партыі, а аб больш рашучым правядзеньні палітычнай лініі і прынцыповай клясавай палітыкі партыі.

У галіне барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны неабходна побач з пёзунгам абароны СССР высунуць на першы плян тыя пытаньні, дзе пагроза імпэрыялістычнай вайны найбольш непасрэдна завострана супроць германскіх рабочых. У гэтым духу павінна быць праведзена кампанія 1 жніўня — дня міжнароднай барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны.

Умацоўваць адзіны чырвоны фронт

Далей тав. Тэльман указаў на неабходнасьць узмацненьня балвога чырвонага адзінага фронту супроць фашызму шляхам разгортваньня найшырэйшых масавых антыфашысцкіх выступленьняў. Гэты антыфашысцкі адзіны фронт, які павінен прыняць формы барацьбы, вырастаючай у палітычныя масавыя забастоўкі, і якога ўсё больш настойліва патрабуе частка сацыял-дэмакратычных і рэфармісцкіх рабочых, нельга аддаліць ад барацьбы супроць наступленьня капіталу і за пралетарскія патрабаваньні на прадпрыемствах і біржах працы, яго нельга аддзяліць ад барацьбы за эканамічныя інтарэсы астатніх працоўных пластоў. Партыя ў рэвалюцыйная прафпазыцыя ўсюды павінны ўмець увязаць сваю работу з штодзённымі патрабаваньнямі рабочых. Як указаў лютаўскі пленум ЦК, партыя павінна ўзмацніць работу па арганізацыі і кіраўніцтве масавымі боямі і выступленьнямі ва ўсіх вобласьцях.

Пытаньні ўнутрыпартыйнага жыцьця

Усе гэтыя задачы, — гаворыць далей тав. Тэльман,—самым цэсным чынам зьвязаны з пытаньнямі ўнутрыпартыйнага жыцьця. Рост нашай партыі за апошні год, вялізарны процант новаўступіўшых членаў партыі робяць задачу ўнутранога ўмацаваньня партыі і бальшавіцкага выхаваньня партыйных кадраў пытаньнем рашаючага значэньня. Гэта зьяўляецца таксама прадпасылкай перамананьня цякучасьці партыйных радоў. І тут трэба будзе пераманчы вялікія недахопы. У сувязі з гэтымі задачамі партыйнае кіраўніцтва павінна вызваліць партыйную работу ад пут схэматызму і бюракратызму і кіравацца ўзрастаючымі патрабаваньнямі, якія прад'яўляюцца партыі.

Поўнае адзінства

Спрэчкі, якія разгарнуліся пасьля дакладу тав. Тэльмана, таксама, як і прынятыя пастановы, сьведчылі АБ ПОЎНЫМ АДЗІНСТВЕ Ў ЦЭНТРАЛЬНЫМ КАМІТЭЦЕ. Гэта адзінства адносіцца ня толькі да пастаноў па пытаньнях палітычнай тактыкі партыі ў розных галінах рэвалюцыйнай масавай работы, але і да тых мерапрыемстваў, якія былі выпрацаваны Цэнтральным Камітэтам у справе расстаноўкі партыйных сіл у арганізацыйных аснонах і ў справе ўмацаваньня бальшавіцкай дысцыпліны партыі.

У заключэньне «Ротэ Фанэ» канстатуе, што канфэрэнцыя пленуму ЦК зьяўляецца выходным пунктам рашучай і актыўнай мабілізацыі ўсіх сіл партыі, каб перад тварам абвостранага клясавага змаганьня разгарнуць рэвалюцыйную масавую барацьбу і дабіцца новых рэвалюцыйных посьпехаў.

Менск, друкарня «Зьвязды»

Зацьверджана Калегіяй НКЗ СССР ад 27-IV-1932 г. (прат. №26)

ПАЛАЖЭНЬНЕ АБ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ У СЬВІНАГАДОЎЧЫХ ТАВАРНЫХ КАЛГАСНЫХ ФЭРМАХ

I. Арганізацыйная структура фэрмы

Сьвінагадоўчая фэрма зьяўляецца асноўнай вытворчай адзінкай калгасу, якая займаецца выключна сьвінагадоўляй: разьвядзеньне, вырасьліваньне, забясьпячэньне гаспадарчымі будынкамі, стварэньне кармовай базы, адкорм сьвіней і здача таварнай прадукцыі.

У межах зацьверджанага калгасам ватворчага пляну, сьвінагадоўчая фэрма вядзе сваю вытворчую працу самастойна. Фэрмай кіруе загадчык фэрмы, які дзейнічае на падставе адзіначальня і нясе пэрсанальную адказнасьць за ўсю гаспадарчую дзейнасьць фэрмы, у адпаведнасьці з зацьверджаным палажэньнем аб загадчыку фэрмы.

Прызначэньне і звальненьне з працы загадчыка фэрмы, тэхніка-сьвінавода і вэтфэльчара робіцца праўленьнем калгасу з абавязковым зацьвярджэньнем заг. райканторы, або райупаўнаважанага сьвінаводкалгасцэнтру. Усе астатнія калгасьнікі, калгасьніцы, сьвінаводы выпучаюцца праўленьнем калгасу з удзелам заг. фэрмы, а звальняюцца з працы выключна па меркаваньні заг. фэрмы.

У фэрмах тэхнік-сьвінавод зьяўляецца адначасова памочнікам заг. фэрмы, які разам з загадчыкам фэрмы нясе адказнасьць за ўсю гаспадарчую дзейнасьць сьвінафэрмы.

З мэтай правільнай арганізацыі працы і пастаноўкі ўсяго работы на фэрме пад адзіным кіраўніцтвам заг. фэрмы, пагалоўе сьвінагадоўчай фэрмы падзяляецца на асобныя групы з самастойным і закончаным зваротам стада ў складзе ня больш 21-й сьвіноматкі, 1-го кныра і прыплоду ад іх да поўнага вырасьліваньня маладняка, г. зн. да здачы (продажу) яго ў адкормленым выглядзе, або перадачы ў матачнае стада.

Для абслугоўваньня кожнай такой групы сьвіней выпучаецца самастойная брыгада са сталым складам калгасьнікаў, калгасьніц-сьвінаводаў, у колькасьці ня менш 3-х асоб.

Перамяшчэньне пагалоўя з адной групы ў другую не дапускаецца (апрача выпадкаў пастаноўкі сьвіней у агульны ізалятар фэрмы, у часе заразьлівых хвароб), чым і дасягаецца поўная ліквідацыя абязьлічкі па догляду за пагалоўем і забясьпечваецца сапраўдная адказнасьць брыгады за выкананьне вытворчых заданьняў.

II. Арганізацыя сьвінагадоўчай брыгады і ліквідацыя абязьлічкі

«Шырокае распаўсюджаньне павінна атрымаць праверанае на вопыце лепшых сьвінагадоўчых калгасных фэрм практыка абслугоўваньня працуючымі ў брыгадзе калгасьнікамі пэўнай групы жывёлы з тым, каб жывёлагадоўчая брыгада і ўваходзячыя ў яе калгасьнікі аплачваліся ў залежнасьці ад вынікаў іх працы (колькасьць надоенага малака, прырост вагі маладняка, разьмер прыплоду і г д.)» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага 1932 г.).

У адпаведнасьці з гэтым у кожным калгасе, які мае сьвінагадоўчую таварную калгасную фэрму, павінны быць створаны спэцыяльныя сьвінаводчыя брыгады з пастаянным складам калгасьнікаў для сталага абслугоўваньня кожнай асобнай групы сьвіней.

Для абслугоўваньня сьвінняга пагалоўя кожнай групы арганізуецца самастойная брыгада ў складзе 3-х сьвінаводаў, з якіх адзін зьяўляецца старшым сьвінаводам (брыгадзірам), працуе на-роўні з іншымі сьвінаводамі брыгады і нясе адказнасьць за правільную расстаноўку сіл і разьмеркаваньне работ у самой брыгадзе.

Уся брыгада нясе поўную адказнасьць за выкананьне месячнага, квартальнага і гадавога пляну здачы (продажу) таварнай прадукцыі, за становішча і захаваньне стада, за яго фармаваньне ў адпаведнасьці са зваротам стада, які ўстаноўлен вытворчым заданьнем для брыгады.

У тых сьвінафэрмах, дзе ёмкасьць малоўных сьвінарнікаў большая, чымся пагалоўе, якое замацавана за брыгадай, сьвінарнік можа быць падзелен на некалькі груп, для чаго ў сьвінарніку неабходна правесьці адпаведнае разьмеркаваньне. Пры гэтым, разьмер замацаванага за брыгадай пагалоўя таксама не павінен перавышаць 21-й маткі, з прыплодам і 1-го кныра-вытворніка.

У калгасах, сьвінафэрмы якіх маюць менш 21-й маткі, напоўнае пагалоўе матак замацоўваецца для абслугоўваньня за 2-ма калгасьнікамі з усім зваротам стада. У тым выпадку, калі на фэрме менш 10 матак, яны прымацоўваюцца да аднаго калгасьніка, якому даецца на дапамогу падрэстак.

Для кожнай брыгады пасобку, а ў тым выпадку, калі пагалоўе менш 21-й маткі, для выпучаных калгасьнікаў устанаўляецца гадавое вытворчае заданьне, у якім павінна быць паказана:

а) колькасьць апаросаў і парасят, атрыманых ад кожнай сьвіноматкі, у адпаведнасьці з плянам злучкі і апаросаў;

б) прырост жывой вагі рамонтных падсьвінкаў і кормных сьвіней, колькасьць сьвіней для адкорму і здачы ў якасьці таварнай прадукцыі;

в) норма і парадак кармленьня;

г) колькасьць і склад кармоў;

д) зоатэхнічныя, вэтсанітарныя і іншыя мерапрыемствы, абавязковыя да выкананьня сьвінаводамі і іншымі працаўнікамі фэрмы па павялічэньні і павышэньні якасьці прадукцыі, а таксама па барацьбе з захворваньнем;

е) зьдзельная ацэнка адзінкі прадукцыі ў колькасьці налічаных працадзён за выкананьне ўсяго вытворчага заданьня і г. д.

У абавязкі брыгады ўваходзіць поўнае абслугоўваньне ўсяго даручанага ёй сьвіннога пагалоўя:

а) падрыхтоўка кармоў;

б) свачачасовае кармленьне і паеньне;

в) выпуск на прагулку і пашу;

г) прыбіраньне і ўтрыманьне ў чыстаце станкоў свайго пагалоўя;

д) чыстка і мыцьцё жывёлы;

е) даяўрства ўначы;

ж) выяўленьне прыходзячых у ахвоту матак і правядзеньне злучкі;

з) прыём парасят у часе апаросаў і іх падкормка і г. д.

У мэтах нагляду за становішчам пагалоўя, замацаванага за брыгадай, у сьвінарніку, як правіла, павінен знаходзіцца днём і ўначы (без адлучкі) пачарэ, адзін з сьвінаводаў брыгады.

У пэрыяд масавых апаросаў матак, замацаваных за брыгадай, у сьвінарніку павінен быць вызначан падзяжурны на дапамогу дзяжурнаму.

Уся праца вядзецца брыгадай у строгай адпаведнасьці з вэтэрынарна-зоатэхнічнымі запатрабаваньнямі і ўстаноўленымі правіламі ўнутранога распарадку.

Для выкананьня ўсіх падсобных работ (падвозка вады, корму, подсьцілу і апалу, адвозка гною і г. д.) арганізуецца самастойная брыгада, або група для абслугоўваньня ўсёй фэрмы, выходзячы, калі на фэрме менш 10 матак, яны прымацоўваюцца да аднаго калгасьніка, якому даецца на дапамогу падрэстак.

У пашавы пэрыяд абслугоўваньне сьвіннога пагалоўя, замацаванага за брыгадай, праводзіцца тымі-ж сьвінаводамі, што і ў стойлавы пэрыяд. Зьмены ў складзе сьвіней, замацаваных за кожнай брыгадай у пашавы пэрыяд не дапускаюцца.

(Працяг будзе).

КАМЫШЫНСКАЯ ГІДРАСТАНЦЫЯ—ГЭТА ЧАТЫРЫ ДНЕПРАБУДЫ

МАСКВА. У сувязі з пастановай ЦК партыі і Саўнаркому Саюзу аб абвадненьні Заволжжа, **праф. Чаплыгін** — аўтар праекту рэканструкцыі Волгі паведаміў супрацоўніку ТАСС наступнае:

Праблема абвадненьня Заволжжа, якая мае вялізарнае народна - гаспадарчае значэньне, зьяўляецца грандыёзнай па маштабу і замыслу. Даволі ўказаць, што **па магутнасьці Камышынская гідрастанцыя** (1,8—2 млн. кілёват) **будзе роўна амаль чатыром Днепрабудам.** Для параўнаньня трэба яшчэ ўказаць, што ПАЗШ патрацілі для абвадненьня плошчы ў 2 млн. гэкт. **10 год. Мы-ж павінны правесьці ірыгацыю ў два разы большай плошчы ў 5 год.**

Абвадненьне будзе рабіцца машынным спосабам. Пры гэтым, відаць, будзе ўжывацца электрадажджаваньне. Мэтадам дажджаваньня пры ірыгацыі карыстаюцца часткова ў Германіі, але амаль палкам у дробнай індывідуальнай гаспадарцы. Рухомай сілай зьяўляецца тут выключна трактар. У нашых-жа ўмовах буйнай сацыялістычнай гаспадаркі, пры таннай энэргіі Волгі, мы зможам ужываць электрадажджаваньне, карыстаючыся шырокай сеткай электраперадач і каналаў, якімі будзе пакрыта ўся плошча, што абвадняецца. Рухавой сілай у нас будзе ўжо не трактар, а **электраматор.** Электрадажджаваньне дае вялікую эканомію ў расходваньні вады, дазваляе лепш рэгуляваць абвадненьне, у значна большай меры, чым самацёчнае абвадненьне, папярэднае ад засьмечанасьці глебу, выключае затраты на плянаваньне палёў і г. д.

Ірыгацыйны пэрыяд працягваецца толькі тры месяцы. Калі на працягу гэтага пэрыяду падаваць ваду на тэрыторыю, якая абвадняецца непасрэдна з Волгі, дык будуць патрэбны вялізарнай магутнасьці помпы, вялікае выдаткаваньне электраэнэргіі. Таму мною прапанавана стварыць на тэрыторыі Заволжжа сетку вадасховаў, адкуль можна качаць ваду **круглы год.** Гэта дазваляе ў некалькі разоў вынізіць магутнасьць помпаў і скараціць выдатак энэргіі.

Для абвадненьня Заволжжа неабходна будзе прыкладна **20 мільярдаў кбм. вады.** Пры гэтым палова, магчыма нават дзьве трэція часткі вады, трэба будзе акумуляваць у вадасховах. Будаўніцтва такіх вялізарных вадасховаў значна палягчаецца спрыяючымі глебавымі ўмовамі Заволжжа.

Камышынская гідрастанцыя будзе прадстаўляць **грандыёзную пабудову.** Даволі ўказаць, што вышыня плаціны будзе раўняцца **30 мэтрам,** а даўжыня яе вадазьліўнай часткі звыш 2 клм. (уся даўжыня каля 3 клм.). Кошт станцыі акрасьліваецца арыентовачна **1,5 млрд. руб.,** а ўсёй сыстэмы абвадненьня — прыкладна **5 млрд. руб.**

Няма сумненьня, што пад кіраўніцтвам партыі і падтрыманьні ўсёй краіны грандыёзная праблема рэканструкцыі Волгі для барацьбы з засухай будзе вырашана з посьпехам.

Масавае ўцяканьне фінляндзкіх рабочых у СССР

БЭРЛІН. Фінляндзкія газэты б'юць трывогу з прычыны выпадкаў масавага пераходу фінляндзкіх рабочых на тэрыторыю СССР, якія асабліва сталі частымі ў апошні час. Газэты паведамляюць аб масавых уцяканьнях у раёне Ювэскюля, Кексгольма, а таксама Гельсінгфорсу рабочых на савецкую тэрыторыю, ня гледзячы на рызыку нелегальнага пераходу граніцы, а таксама рэпрэсіі з боку ўлады. «Гувудстадбляцдэт» (орган шведзкай партыі) паведамляе, што гэтымі днямі ў СССР перайшла група рабочых адной нядаўна закрытай папяровай фабрыкі.

Газэты пашыраюць вэрсію аб тым, што нібы рабочыя - перабежчыкі вярбуюцца «спэцыяльнымі савецкімі агентамі», каб гэтай вэрсіяй утаіць той факт, што масавыя ўцяканьні фінляндзкіх рабочых зьяўляюцца рэзультатам вялікага беспрацоўя, якое зараз пануе ў Фінляндыі і якім ахоплена каля 50 проц. рабочых.

Адстаўка германскага ўраду

БЭРЛІН, 30. Апублікавана наступнае афіцыяльнае паведамленьне: «Прэзыдэнт Гіндэнбург прыняў сёньня канцлера Брунінга, які заявіў аб адстаўцы ўсяго габінэту міністраў. Гіндэнбург ускладзе на падаўшых у адстаўку міністраў абавязак часовага вядзеньня спраў». Гіндэнбург прыме сёньня прадстаўніка ляндтагу ЛЕБЭ і БУДЗЕ З ІМ ВЕСЬЦІ ГУТАРКУ АБ ФАРМАВАНЬНІ НОВАГА ЎРАДУ. (ТАСС).

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Трэці агрэгат Днепрабуду пастаўлен на сушку

КІЧКАС. 26 мая пасьля выпрабавальнага пуску пастаўлен на сушку трэці самы магутны агрэгат ДЭС.

Першы агрэгат працуе бесьперабойна. На 26 мая ён выпрацаваў 2.220 тыс. кілёват-гадзін электраэнэргіі.

Савецкі бавоўнакамбайн

ХЭРСОН. Першы савецкі бавоўнакамбайн, выраблены на заводзе імя Пятроўскага, выпрабоўваўся ў стацыя парным парадку, а таксама і ў палявых гаспадарках ва ўмовах збору леташняй бавоўны.

Камісіяй ў складзе прадстаўнікоў Наркамзему, «Главхлопкома» і навуковых інстытутаў бавоўнакамбайн прызнан прыгодным да работы.

Сельгасмашыны

Віцебскі завод «Чырвоны мэталіст» 25 мая выпусьціў 4 балотных плугі, што складае 235,3 проц. заданьня, 21 карнярэзку—100,9 проц., 15 жмыхадрабілак—89,8 проц. і 15 бораў «Зіг-заг». Вытворчая праграма за дзень выканана на 67,9 проц.

***

21 саломарэзку (113 проц. заданьня), 25 сіласарэзак «Папэк» (76%) і 3 канюшнасартоўкі (75 проц.) выпусьціў **завод Гомсельмаш 25 мая.**

Вынікі работы шкляной прамысловасьці за другую дэкаду мая

Заводы Белшклоаб'яднаньня за другую дэкаду мая далі прадукцыі на 364,7 тыс. руб., што складае 43,5 проц. месячнага пляну. **Першае месца ў выкананьні пляну заняла гута імя Домбаля—62,8 проц.** месячнага пляну, другое месца—гута «Кастрычнік»—45,2 проц., трэцяе месца—«Пралетары»—41,3 проц., чацьвертае—завод «Ноўка»—38,3 проц. і апошняе месца—гута «Ільліч»—9 проц. месячнага заданьня.

Будматар'ялы НА БАБРУЙСКІМ ДРЭВААПРАЦОЎЧЫМ КАМБІНАЦЕ

За пятую пяцідзеўку мая завод № 6 расьпілаваў 1.035 кбм. сырцу, што складае 115,9 проц. заданьня; завод № 7 расьпілаваў 1.334 кбм.—115,7 проц.; лесапэх—3.865 кбм. — 98,7 проц. Белядрэўны цэх вырабіў прадукцыі 11.563 кв. м.—94,6 проц. і цэх стандартных дамоў выпусьціў 12 дамоў.

***

27 мая камбінат «Каміптэрн» расьпілаваў 181,1 кбм. сырцу — 115,2 проц. пляну.

Папера

Добруская папяровая фабрыка «Герой працы» за 25 мая выканала **плян** выробу паперы на 76,6 проц. — выпушчана 62,4 тоны. Саломенная цэлюлёзы выраблена 10 тон — 84 проц.; дрэўмасы — 1 тона. Прастоі складалі 55 гадзін, замест 9 паводле пляну.

***

Шклоўская папяровая фабрыка «Спартак» за 25 мая выпусьціла 14,2 тоны паперы на суму 11.760 руб. — плян выкапан на 75,6 проц.

Прастоі складалі 8 гадзін.

Скура і абутак

Чырвонасьцяжная гарбарня «Бальшавік» за пятую пяцідзеўку мая выканала прамфінплян на 102,3 проц. Выпушчана прадукцыі на 195 тыс. руб.

***

Віцебская гарбарня за пятую пяцідзеўку мая дала прадукцыі на 95,9 тыс. руб., што складае 100,2 проц. пляну.

***

На 90,7 тыс. руб. выпусьціла прадукцыі **Магілеўская рымарна-сядзельная фабрыка** за пятую пяцідзеўку мая. Прамфінплян выкапан на 84,4 проц.

***

На 650 тыс. руб. (82,1 проц. пляну) дала прадукцыі **Магілеўская гарбарня імя Сталіна** за пятую пяцідзеўку мая.

Вопратка

Гомельская швэйная фабрыка «Каміптэрн» выканала прамфінплян за пятую пяцідзеўку мая на 107,3 проц. Выпушчана прадукцыі на 278,7 тыс. руб.

***

На 30,9 тыс. руб. (93 проц. пляну) дала прадукцыі **Віцебская швэйная фабрыка «Прафінтэрн»** за пятую пяцідзеўку мая.

Розныя вырабы

Віцебская голкавая фабрыка за пятую пяцідзеўку мая выканала прамфінплян на 107,1 проц. Выпушчана прадукцыі на 26,4 тыс. руб.

***

На 73,9 тыс. руб. (100,1 проц. пляну) дала прадукцыі **Віцебская акуляр ная фабрыка** за пятую пяцідзеўку мая.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

ПАТРЭБНЫ
вопытныя **карактары і падчытчыкі,** якія добра ведаюць беларускую мову.
Зварачацца: Савецкая, 63, друкарня газэты „Зьвязда“

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ — Гукавы гістарычна-мастацкі фільм **МЕРТВЫ ДОМ**

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ — Новы мастацкі фільм **МАРЦІН ВАГНЭР**

„ПРАЛЕТАРЫ“ — **ЗДРАДНІК** кіно-раман у 8 частк.

„СПАРТАК“ Пач.: 6-30, 8, 9-30, 11 г. Касы з 5 г. — Гістарычны фільм **КРЫЛЬЛІ ХАЛОПА** трагедыя ў 9 частках.

ПРАПАНУЕЦЦА
каапупаўнаважаным прадпрыемстваў і ўстаноў г. Менску
НЕ ПАЗЬНЕЙ
2 чэрвеня
прадставіць у бюро выдачы наборных дакументаў **сьпісы** маркі картак і атаўшыяся **ХЛЕБНА-ПРАДУКТОВЫЯ КАРТКІ.**
Вінаватыя ў невыкананьні гэтага будуць прыцягнуты да судовай адказнасьці.
Гарснаб **ГАНТМАН.**
Заг. бюро выдачы наборных дакументаў **ШАПАТКОЎСКІ.**

**ЗАКУПАЧНАЙ КА